ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №2 (90)
(люты)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

ЮБІЛЕЙ

«ВЯСНА БУДЗЕ!»

ПАЭЗІЯ ЗМАГАННЯ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ

Алеся ЧАРНАВОКАЯ

8 лютага — 100 гадоў з дня нараджэння Валянціна Таўлая. На першы погляд яго біяграфія выдатна адпавядае вобразу паэта-камуніста: Заходняя Беларусь, падпольная камсамольская арганізацыя, сем гадоў «польскіх» астрогаў за камуністычную дзейнасць, зноў падпольная барацьба ў час Вялікай Айчыннай вайны…

Але падставай першых сур'ёзных праблем былі не камуністычныя погляды, а нацыянальная самасвядомасць: у Слонімскай настаўніцкай семінарыі хлопец падчас перапісу паведаміў, што з'яўляецца беларусам і размаўляе па-беларуску, за што быў вымушаны неўзабаве пакінуць вучобу (цікавы факт у дачыненні да надзейнасці вынікаў усемагчымых перапісаў мінулага стагоддзя).

Бацька паэта, Павел Таўлай, быў сябрам Беларускай Сацыялістычнай Грамады — і вершы Валянціна вельмі рана пачалі тычыцца менавіта палітычных праблем: «О ты, Згода, адгукніся, / Дзе ты прападаеш? / Цябе рэдка дзе пабачыш, / Рэдка дзе бываеш!» — пісаў Валянцін Таўлай з нагоды «палемікі паміж грамадоўцамі і хадэкамі, што разгарнулася на старонках заходнебеларускага перыядычнага друку ў сярэдзіне 20-х гадоў».

У далейшых творах ён не спяшаўся ў кожным радку абвяшчаць сваё захапленне камунізмам, ухваляць савецкую рэчаіснасць і марыць пра светлую будучыню — хаця ёсць у яго і «чырвоны жар», і «ясная сцежка да шчасця», і «панска-бліскучы бот». Зрэшты, для паэтаў Заходняй Беларусі, якім давялося стаць палітвязнямі, больш актуальнай была тэма змагання за волю і долю свайго краю:

І стаю я ў захапленні,
Неразгаданым і новым,
Поўны цёплае любові,
І гатоў гарэць, загінуць
За вясну маёй краіны…

Радасна ўздыхнулі грудзі:
— Адчыняйце хаты, людзі!
— Адчыняйце сэрцы, людзі!
— Вясна будзе! Вясна будзе!

Гэты верш напісаны Валянцінам Таўлаем у чатырнаццаць гадоў, але і многія іншыя яго творы бліжэй да патрыятычнай лірыкі, чым да ўльтрасавецкай паэзіі. Большасць з іх, натуральна, былі складзены ў астрогах — паводле ўспамінаў, там многія звярталіся да паэзіі (верш «вясновае сэрца бароніць ад шэрай, астрожнай тугі»). Адпаведна, пашыранай была тэма зняволення і чакання свабоды — расповеды пра жыццё вязняў (і нават паэма — «Сухар»!), гнеўныя тырады («Скаваны бунтар», «Думы непакорныя») і абсалютна шчымлівыя, роспачныя радкі:

Грудзі ныюць, сэрца б'ецца,
Карагоды зззяюць зор.
Зоры, зоры! Дзе ж мне дзецца?
А між вас прастор… прастор…

Гэтыя вершы выдатна цытуюцца ў сучасным палітычным і літаратурным кантэксце — зрэшты, твораў такога кшталту багата на старонках сённяшніх часопісаў ды паэтычных зборнікаў, яны часта ператвараюцца ў песні маладых музычных гуртоў.

Сябры заўсёды поплеч, і іх шмат, ворагі — каты і тыраны, верш натхняе да барацьбы, хочацца трапіць праз краты да зор, экспазіцыя таксама знаёмая:

Ідзе за годам год,
Сівеюць людзі, хаты,
І ўсё ў ярме народ,
А над шляхамі — краты.

Магчыма, такімі вершамі пачынаюць многія з тых, хто пакіне яркі след у беларускай літаратуры — галоўнае, каб своеасаблівы жанр «паэзіі змагання» са сваім наборам матываў, сюжэтных схемаў і літаратурных штампаў не замінаў аўтару выказваць цікава і самастойна. Паэт, апанаваны прагай барацьбы — з польскімі панамі, фашыстамі, савецкай уладай ці кім-небудзь яшчэ, — вельмі часта звяртаецца да ўжо вядомых вобразаў, ідэй, стылістычных прыёмаў. Бо чароўнае натхненне насамрэч становіцца плынню стэрэатыпаў, сімвалічных, акцыянальных і культурных кодаў, якія з галавой накрываюць аўтара і знаходзяць выйсце ў радках, строфах, вершах, вельмі падобных да некім некалі ўжо напісаных…

Ёсць людзі, арганічна не здольныя адчуваць, бачыць і думаць у агульнапрынятым рэчышчы — яны прынцыпова не могуць пісаць банальшчыну. Для іншых ёсць багата магчымасцяў супрацьстаяць волі дыскурса: у межах пэўнай тэмы можна вылучыць тыя моманты, якія звычайна застаюцца незаўважанымі, змяніць ракурс ці агульны фон. Калі ж гэта не атрымліваецца, застаецца шчыраваць над формай, шукаць адмысловыя вобразы — што і рабіў Валянцін Таўлай, рыхтуючы ў пасляваенны час свае вершы для першага зборніка.

Многія трапныя радкі паэта («пілую вершам краты», «удавою тужыць ніва») — плён доўгага, шматгадовага абдумвання твораў. Кранае нават верш «Першамайскія сцягі» («Цяпер яны, як дужыя арлы, /На ветры буйным распасцёрлі крыллі, /А некалі ж мы іх, як арлянят малых, /Тулілі к сэрцу і ўзлятаць вучылі»), і сумна, што завяршаецца твор пагрозлівым заклікам «трымаць вострым штык і ўзнятай галаву» — лірычны настрой быў нядоўгім.

Пошук адмысловых вобразаў ішоў марудна, што, верагодна, было пэўнай праблемай. Валянцін Таўлай з'яўляўся намеснікам дырэктара музея Янкі Купалы — і планаваў напісаць дысертацыю па творчасці класіка, стварыць аповесць, прысвечаную яго дзяцінству. Задумы не спраўдзіліся: паэт-падпольнік часта быў на паўкрока ад смерці, каля дзясятка такіх выпадкаў апісана ва ўспамінах яго родных і сяброў. У трыццаць тры гады ён памёр ад хвораага сэрца…

Музей, бюст, мемарыяльная дошка… Валянціну Таўлаю пашанцавала больш, чым многім рэпрэсаваным аўтарам, унёсак якіх у беларускую літаратуру быў дакладна не меншы. Зрэшты, за савецкі рэжым ён сапраўды змагаўся, і цяжка сказаць, кім Валянцін Таўлай быў у большай ступені: камуністам, патрыётам ці паэтам?

Іерархія беларускіх класікаў дагэтуль патрабуе пэўнай карэкціроўкі — і месца для гэтага аўтара на прыступках пачэснай лесвіцы зарэзервавана найперш дзякуючы марам маладога змагара пра беларускую вясну.

Мастацкія здабыткі класікаў (у нашым выпадку — Якуба Коласа і Янкі Купалы) у творах непасрэдных паслядоўнікаў успрымаюцца даволі свежа — далей мы маем справу з нацыянальнай традыцыяй, сталымі вобразамі-сімваламі ды эпігонствам. А жанр «паэзіі змагання» дагэтуль застаецца неўміручым, і варта думаць, што праца ў гэтым рэчышчы будзе плённай.

ДА 80-ГОДДЗЯ САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

НОВЫ «ЭКСЛІБРЫС»

ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» абвяшчае пачатак прыёму твораў на конкурс маладых пісьменнікаў «Экслібрыс» імя Аляксандра Уласава — публіцыста, рэдактара газеты «Наша Ніва», 140-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца сёлета.

Конкурс прысвечаны літаратуры нон-фікшн. Партнёры конкурсу — кампанія «Prestigio», газета «Наша Ніва», грамадская культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!».

На конкурс будуць прымацца творы ў наступных жанрах: эсэ (літаратуразнаўчае, сацыякультурнае, гістарычнае, краязнаўчае, этнаграфічнае), нарыс, публіцыстычны (аналітычны) артыкул, літаратурны агляд, рэцэнзія і інш.

Мова твораў — беларуская або руская, аб'ём тэксту — не больш за 20.000 знакаў з прабеламі.

Да ўдзелу запрашаюцца аўтары ва ўзросце да 40 гадоў.

Тэмы конкурса:
«Асоба ў прасторы і часе»
«Аўтар. Герой. Чытач»
«Мая ідэнтычнасць»
«Пераадоленне абмежаванняў»
«Суіснаванне і супрацьстаянне»

У межах гэтых агульных тэмаў могуць быць раскрытыя любыя больш вузкія і канкрэтныя падтэмы. Прымаюцца матэрыялы, якія раней нідзе не друкаваліся.

Журы конкурса:
Сяргей Дубавец, Алесь Пашкевіч, Аляксандр Фядута, Ірына Шаўлякова, Вольга Шпарага.

Тэксты на конкурс можна дасылаць файламі ў фармаце **.doc** да **1 жніўня 2014 года** на адрас sbp@lit-bel.org, пазначыўшы тэмай ліста «Конкурс». У лісце мусіць быць наступная інфармацыя: імя, прозвішча, дата нараджэння ўдзельніка, кантактны нумар тэлефона і e-mail.

Пяць пераможцаў конкурса атрымаюць найлепшыя рыдэры ў лінейцы кампаніі «Prestigio», а іх творы будуць змешчаныя ў электронных бібліятэках ebooks.prestigioplaza.com і e-kniga.by. Аднаго з удзельнікаў чакае спецыяльны прыз ад газеты «Наша Ніва». Асобныя тэксты будуць апублікаваны ў «Нашай Ніве», «новачаснай» «Літаратурнай Беларусі», «Дзеяслове».

БІТВА ПАЭТАЎ

Маладыя і сталыя, пачаткоўцы і аўтарытэты, рамантычныя і рашучыя, горадзенскія і не толькі… Так выглядаў склад удзельнікаў другога горадзенскага паэтычнага слэму, які адбыўся ў антыкварні «Жывы час».

Фота Яна Лялевіча
Ганна Аўчыннікава

Слэм распачалі яго вядучыя — Аляксей Шота і Хрысціна Марчук.

«Мы хочам, каб нашыя таленавітыя гарадзенскія паэты выйшлі са старонак паэтычных зборнікаў у публіку», — тлумачыць сутнасць слэму Хрысціна.

Шаноўныя госці сустрэчы — Данута Бічэль і Аляксей Пяткевіч.

Выступілі Ала Петрушкевіч, Сяргей Астравец. Ад Дзяніса Жыгаўца вядучыя папрасілі «драйву». І той пастараўся — атрымлівалася эмацыйна.

Ці то журы трапілася вельмі лагоднае, ці то ўдзельнікі найвышэйшага ўзроўню — максімальны бал выступоўцы атрымлівалі вельмі часта.

Ганна Аўчыннікава запомнілася не толькі густоўнай паэзіяй, але і зоркай на чале…

Па-рознаму «запальвалі» публіку Антось Янкоўскі, Валера Руселік, Анатоль Брусевіч, Святлана Куль.

Журы абвесціла вынікі: найвялікшую колькасць балаў набрала паэтка Ганна Аўчыннікава. На другім месцы — Валера Руселік. Трэцяе заняла Святлана Куль-Сяльвестрава.

Кожны пераможца атрымаў памятныя прызы, у тым ліку кнігу Юры Гуменюка «Назаві мяне геніем». Галоўны прыз — падарункавае выданне «Спадчына Беларусі» ў скуранай вокладцы.

Чакаем працягу!

Паводле www.t-styl.info

«ВЕРШЫ НА АСФАЛЬЦЕ»-III

13–16 лютага 2014 года ў Мінску праходзіў Трэці міжнародны паэтычны фестываль «Вершы на асфальце», прысвечаны памяці Міхася Стральцова. Арганізатары фестывалю — Саюз беларускіх пісьменнікаў і Беларускі ПЭН-цэнтр.

Партнёры фестываля — Амбасада Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Інстытут імя Гётэ ў Мінску, Польскі Інстытут у Мінску, Шведскі саюз пісьменнікаў і грамадска-культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!».

На фестывалі выступілі літаратары з Беларусі, Ісландыі, Польшчы, Украіны, Расіі, Літвы. У праграме мерапрыемстваў былі Слэм-сэйшн, паэтычныя чытанні, міжнародны праект «Magnus Ducatus Poesis — Вялікае Княства Паэзіі», прэзентацыі новых кніг, у тым ліку — серый «Пункт адліку» і «Кнігарня пісьменніка» СБП, зборніка пераможцаў конкурса імя Максіма Танка, а таксама электронных выданняў BYBOOKS.

14 лютага больш за тры гадзіны беларускія і замежныя паэты змагаліся за званне найлепшага слэмера. Трэці раз у межах паэтычнага фестываля адбыўся слэм Святога Валянціна. У ім узялі ўдзел 20 паэтаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы. У выніку сумленнай барацьбы і нават інтрыгі (калі суддзі, выбраныя сярод гледачоў, доўга не маглі вызначыцца, каму паставіць вышэйшыя балы — Юлі Цімафеевай або Віктару Жыбулю) у паўфінал слэму прайшлі 8 паэтаў: Аркадзь Штыпель, Раіса Баравікова, Марыя Мартысевіч, Анастасія Векшына, Марыя Галіна, Таццяна Светашова, Глеб Лабадзенка і Вера Бурлак. Да фіналу дабраліся тры слэмеры, найлепшым з якіх быў прызнаны Аркадзь Штыпель з Расіі.

Новы дзень таксама запомніўся разнастайнасцю жанраў і формаў — былі і паэтычныя чытанні, і кніжныя прэзентацыі, і музычныя выступы, і абмеркаванне буктрэйлера «Смаленне вепрука».

Паэтычны фестываль працягнуўся ў мінскім Інстытуце імя Гётэ. У агуле новая праграма заняла каля шасці (!) гадзін. Цягам дня публікі станавілася ўсё болей, і гэта яскрава сведчыць пра прыхільнасць беларусаў да паэзіі і пра тое, што добрых вершаў шмат не бывае.

lit-bel.org

ЗАЯВА
САКРАТАРЫЯТА ГА «САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ»

Як стала вядома, 11 лютага 2014 года Ашмянскі раённы суд прыняў рашэнне аб забароне на ўвоз выдадзенай у Вільні кнігі літаратуразнаўцы, сябра ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» Алеся Бяляцкага «Асьвечаныя беларушчынай».

Нагадаем, што кніга Алеся Бяляцкага ўяўляе сабой зборнік эсэ і артыкулаў, прысвечаных творчасці беларускіх літаратараў. Тэксты кнігі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў друкаваліся ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях.

Сакратарыят ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» лічыць рашэнне суда палітычна матываваным і выкліканым толькі тым, што аўтар цяпер знаходзіцца ў зняволенні.

РЭЗІДЭНЦЫЯ МАЛАДОГА ЛІТАРАТАРА

Беларускі ПЭН-цэнтр пры падтрымцы Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага Дома правоў чалавека засноўвае ў Вільні Рэзідэнцыю маладога літаратара.

Праграма дае магчымасць творцу ва ўзросце да 30 гадоў два тыдні жыць у Вільні і займацца літаратурнай работай (паэзія, проза, пераклады, крытыка і інш.).

Для таго, каб стаць удзельнікам Рэзідэнцыі маладога літаратара, трэба запоўніць анкету на старонцы ПЭН-цэнтра альбо даслаць заяўку на e-mail info@pen-centre.by з пазнакай «Рэзідэнцыя маладога літаратара».

Першы этап пройдзе з 1 лютага 2014 года па 31 верасня 2014 года.

САКАВІЦКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

06.03.1964 — Уладзімір Фёдаравіч Міхно
07.03.1969 — Ірына Мікалаеўна Ляшкевіч
07.03.1959 — Язэп Язэпавіч Янушкевіч
14.03.1934 — Міхаіл Іванавіч Клебановіч
16.03.1964 — Уладзімір Міхайлавіч Давыдоўскі
23.03.1954 — Аляксандр Васільевіч Кавалёнак
28.03.1939 — Святлана Тарасаўна Каробкіна
28.03.1934 — Канстанцін Аляксеевіч Цвірка
Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

СТАГОДДЗЕ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

У Музеі гісторыі Магілёва, які месціцца ў будынку Ратушы, адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Асуджан я любоўю пажыццёва», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, ураджэнца Магілёўшчыны Аркадзя Куляшова.

Фота MyCity.by

Шматлікім слухачам быў прапанаваны аповед пра жыццё і творчасць Аркадзя Аляксандравіча Куляшова, пра тыя шляхі, якія ад вёскі Саматэвічы Касцюковіцкага раёна прывялі яго да вышынь творчага натхнення.

Гучалі вершы паэта ў суправаджэнні харэаграфічных інсцэніровак, а відэапрэзентацыя дапамагала больш змястоўна адчуць усе адценні куляшоўскай паэзіі.

У вечарыне ўзяў удзел старшыня Магілёўскага аддзялення СБП Мікола Яцкоў — адзначыў актуальнасць і неўміручасць паэзіі Аркадзя Куляшова, якая для кожнага пакалення беларусаў з'яўляецца запатрабаванай і вельмі актуальнай. У выкананні М. Яцкова прагучала некалькі песень на вершы славутага юбіляра.

Ул. інф. Магілёўскага абласнога аддзялення СБП

МАГІЛЁЎ

Адбылося чарговае пасяджэнне Магілёўскага аддзялення СБП. Старшыня Мікола Яцкоў зрабіў справаздачу аб дзейнасці пісьменніцкай суполкі ад пачатку новага года.

Было адзначана, што ў прэсе і ў інтэрнэце з'явіліся цікавыя публікацыі магілёўскіх пісьменнікаў, а таксама матэрыялы, якія тычацца магілёўскай суполкі. У прыватнасці, у «Літаратурнай Беларусі» быў надрукаваны агляд Леаніда Галубовіча «Брама неўміручасці», дзе аўтар выказаў свае меркаванні аб творах, змешчаных у альманаху «Брама».

Старшыня рэдакцыйнай рады «Брамы» Яраслаў Клімуць паведаміў, што праца над чарговым выпускам распачалася, і трэба да канца сакавіка сфарміраваць рэдакцыйны «партфель».

ВЕРШЫ



Фота В.Дубоўскага

ЧЫСТЫ БОЛЬ

Рыгор БАРАДУЛІН

У неба пехатою

З незгаворлівага кірмаша,
Дзе чужыя гандляры і цэны,
Любіць беларуская Душа
Ад спякоты
Затуліцца ў цені.

Свой сакрэт у мудрага каўша,
Поўнага цудоўнага напою.
Пойдзе беларуская Душа
Да настрою ў неба пехатою.

Хопіць смаглавогнішчу сушша,
Каб абсяг не спавядаўся золі.
Бачыць беларуская Душа,
Як заўсёды рупіцца ніколі!.

9.XII.2013

Сляды вады

Сляды вады
Адводзяць ад бяды.
Бяда пажаравокая
Дыміцца.
У нецярпення позірк малады.
Здалёку
Кліча рэха навальніцы.

Сляды вады,
Гадуючы гады,
Атавай смелай
Маладзяць сцяжыны.
У жарабіцы жарсці
Павады
Падраліся
Аб розбегі чужыны.

Сляды вады.
Прыстаўшы ад хады,
Вядуць у незахлын
Зліццё жывое.
Дыктант ад Перуна
Маланка піша,
Ды
Памылкі
Правярае ноч
Савою…

20.XII.2013

Як скруху…

Колькі важыць
Сівое крыло крумкача?
Колькі цягне
Звіслая дзюба?
Адказаў бы, напэўна,
Арак з-пад карча,
Ды яму
На святле быць не люба.
Далячынь маладая
Не ўмее маніць.
Рэха шэпча
На вуха ліху.
Крумкачу сівакрыламу
Хочацца сніць,
Як скруху чорную,
Крумкачыху…

12.XII.2013

* * *

Жарсць нямая.
Каханне ўзросту не мае…

Насуперак…

Насуперак чэрстваму суму
Канкрэтна,
А не ва ўяве
Застолле плыве ў задуму
На негабляванай лаве.
Успыхваюць суха трэскі
Зоркамі Млечнага шляху,
Не можа ўсяісны вецер
Падабраць апранаху
Голаму жаху.
Вавёрка вёрткая давярае
Свае кіпцюры сасне.
У існасці
Ўсё сябе ўспамінае
Ў задуманым сне…

25.XI.2012

Як жывы…

Вырас мярэц
З пугурка цыбатага.
Закінуў анямелую галаву
Прывітаць неба.
Рукі развёў
Адхапіць як болей жыцця,
У паветры разлітага.
Ды знянацку
Некуды галава сплыла.
Абедзьве рукі
Маланка адцяла.
Дагэтуль
Панылы крыж
Усё чакае,
Што вернецца галава
На вострую шыю.
Дзве рукі
Адрастуць учэпіста.
Хоць зноў
У цёмны холад
Не хочацца…

1.III.2013

* * *

Здаецца, ад злосці
Зайздрасць завые,
Нямогла сціскаючы кулакі.
Паважна
І помнікі, і жывыя
Парыж засяляюць
Мае землякі.

Зацятасць
Не баіцца дакораў.
Ільдзіну падпаліць
Юрлівы шал.
Ідзе з Камароўкі Барыс Забораў
І ў небе коз
Пасвіць
Марк Шагал.

Спакоіцца рызыка
З прычыны тае,
Што неба парыжскага
На ўсіх стае…

21.II.2013

Парада

Не спяшайся ў рай
І куме не рай…

* * *

Як дома
Я даўно на гэтым свеце,
Не дужа-ткі
Спяшаюся на той.
Яшчэ ні карты
З мёртваю вярстой,
Ні свечкі,
Што гарачаю слязой
Спакойна свеціць.
Яшчэ на гэтым свеце
Я як дома.
А як на тым,
Дагэтуль
Невядома.

6.X.2013

Ідзеш…

Хто прывязаў званец
Да рогу той,
Што ласуецца
Хрупаткой атавай?
Усё расце
У часа пад пятой.
Вітаючы дарогу
Згадкаю рухавай,
Са свету гэтага
На той
Іду я ўпарта штохвіліны.
І кожны
Мазгаваць павінны,
Як ні хварэй,
Ні рухайся,
Улогам ні ляжы,
Пакуль жывеш,
Ідзеш да той мяжы,
Якая
Чакае.
Спакойнай вечнасці
Прамежак
Нам належыць.
Пазычаным жыццём
Звыкаеш зваць.
Ці ён знянацку
Можа стаць
Апошнім днём.

28.X.2013

* * *

Апошні сон.
Навошта ён?

19.X.2013

Трэба!

Параіцца трэба з журбой,
Як пазнаёміць
Сябе з сабой…

Чысты боль

Ірыне Ржэвускай

Прыгажосць
Сама сябе баіцца.
Толькі б не ўракла
Пяшчоту злосць.
Гаспадынька
Ў беларускага здароўя
Ёсць!
Кажа кіслагубым,
Шчэразубым:
До
Ісці ў самалюбімыя.
Ці
Не лепей бачыць,
Як вожыкастае гняздо
З праменняў
Улагоджаных валасоў
Нечаканку чаканую
Зорную па-зямному
Укаранавала
Рукою слова.
І невыпадкова
Надрэчна недарэчны сум
Усур'ёз
Пакажа нос
І рыне.
А годнай,
Гонкай,
Ганаравітай спадручнай
Неадольнага жыцця
Ірыне
За чысты боль
Рупіць бяззубым хворым
Грымнуць спалоханым хорам
Дзякуй!

4.X.2013

Ласыя

Ласыя да набыцця
Пад дасяжнымі кручамі,
Кватаранты жыцця,
Мы яму знадакучылі…

6.X.2013

Неадлучны

Ценю мой,
Ты за крутой вярстой
Той,
Дзе начуе крок.
Цябе,
Хто не ведае
Анідзе
Стомы ў хадзе,
Пялегуе
Задуменны змрок.
І ты ступаеш за мной,
За маёй спіной,
Як непраспаны крык,
Двайнік неадлучны.
І пакуль некалючы
Ты ў цемрадзь не знік,
Пакуль за раднёю
Не лічу траву —
Жыву!

28.XII.2013

Нанова!

На адкрыццё курсаў «Мова нанова»

Неміну́ча,
Гаюча
Нанова
Раскрываецца шчырае слова.
Мова маці —
Крыніца святая —
Да вытокаў
Намеры вяртае.
Як высокія мроі,
Аблокі
Думкі неба
Ратуюць ад спёкі.
Мы на гэтым свеце
Павінны
Гадаваць мову
Роднай Айчыны.

13 студзеня 2014 г.

Прашу…

Усятрымца ўсяісны,
Дазволь
Затрымацца на грэшнай зямлі.
Моцы дай
Вытрываць боль,
Ад якога пытанні ўзыйшлі.
Для чаго
Я прыйшоў
І калі
Адпусціць на волю душу,
Агарчэлую ў палыне,
Падказаць аднойчы прашу.

Хоць і не мне…

10.XI.2012

АПОВЕД

ПЛЕБЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ

ФРАГМЕНТЫ

Франц СІЎКО

Фота Анастасіі Лазебнай

Ад аўтара

Гульня, паводле тлумачальнага слоўніка, — занятак дзеля забавы ці адпачынку, заснаваны на пэўных правілах, або наўмысныя дзеянні (таемныя замыслы, інтрыгі) для дасягнення нейкай мэты. Плебейскія гульні ўзніклі ў Рыме ў III ст. да н. э. і з'яўляліся не толькі формаю баўлення часу насельніцтва імперыі, але і сродкам адцягнення яго ўвагі ад грамадскіх спраў і актыўнай дзяржаўнай дзейнасці. Пададзеныя напрыканцы аповеду пералік нашых гульняў — далёка не поўны, што кожны пры жаданні можа кампенсаваць досведам уласнага штодзённага ўдзелу ў гульнях таго або іншага кшталту.

Яшчэ не вечар

Гэй, узвейце сваім крыллем,
Арляняты, буйна, бурна…
Я. Купала

Вітанне, племя маладое,
незнаёмае!
А. Пушкін

І вось ужо два месяцы, як я пры гульні новай — выдавецкай. Пры справе быццам бы і карыснай, але разам з тым, калі меркаваць па ўзроўні запатрабаванасці яе канчатковага, так бы мовіць, прадукту, — даволі няўцямнай. Выдаць казённым коштам паўтысячы старонак навуковага даследавання пра дбанне партбосаў першай трэці мінулага стагоддзя аб развіцці ў нейкім рэгіёне, напрыклад, воднага транспарту, каб потым амаль цалкам згрузіць тое выданне ва ўтыль, — якая ўжо тут уцямнасць? Але ж гульня на тое і гульня, каб у яе гулялі, не зважаючы на дробныя акалічнасці кшталту бязглуздых выдаткаў.

У гульні ў навуку, прынамсі на стадыі падрыхтоўкі тэксту ў друк, — немудрагелістыя, але адмысловыя правілы — з пераўвасабленнямі, зменамі роляў, неспадзеўнымі — удалымі і не надта — узлётамі ці, наадварот, падзеннямі. А то і наогул перверсіямі. Гэта калі пахан ад навукі (карыстаючыся слэнгам крымінальным) з лёгкасцю трансвестыта нацягвае на сябе пры неабходнасці маску і апратку згаворлівасці, а залежны ад волі пахана без напругі дэманструе пры нагодзе кіпцюркі ў меру ненавязлівай, у меру зацятай, у меру згаворлівай нязгоды-ўпартасці.

Пахан — кожны, хто на паўпальца вышэй за залежнага; залежны ж ды перыядычна, з увагі на абставіны і размяшчэнне зорак на небе, незгаворлівы — карэктар. Ва ўніверсітэцкай выдавецкай іерархічнай сістэме апошні — ніжэйшая (ніжэй проста не бывае) кадравая адзінка. Якая, аднак, у параўнанні з, напрыклад, шараговым выкладчыкам, мае і пэўныя перавагі.

Адна з тых пераваг — магчымасць у любы час, без увагі на расклад заняткаў, выйсці сабе ў дворык ды, вытрасшы з галавы друз чарговае шматстаронкавае лухты і з асалодаю зацягнуўшыся дымком цыгарэты, папесціць пад сонечнымі промнямі дарэшты атупелыя ад бесперапыннага напружання глузды. І рабіць гэта так часта, што ўжо праз месяц кожны тутэйшы сабака ля ўваходу ў прылеглы да вучэбнага корпуса будынак сталоўкі будзе ведаць цябе ў твар.

Ды, зрэшты, не толькі сабака. Бо, пакуль ты, дзядзька, дзесьці там паліш у самоце ды волю вольнаю і шчадротамі несамавітых гарадскіх відарысаў цешышся, новыя знаёмцы твае, цэрберы калідорныя ад аховы, ужо ладуюць для гульні адмысловае, асвечанае воляю няведама чыёй пачынне.

— А ваш пропуск! Калі ласка! — выбухне аднойчы бездакорна ветлівая і разам з тым пагрозліва ды адсуне цябе ўбок, падалей ад круцёлкі пры ўваходзе, падчас твайго вяртання з перакуру хлопчык-ахоўнік у акуратным, на ўзор мадэлі з моднага часопіса, пінжаку і з понтам папраўвіць прычэплены да лацкана бэдж з экзатычным, амаль што птушыным прозвішчам Койра.

Пропуск, як на злосць, пакінуты ў пакоі, тэлефон тамсама, не насіць жа іх увесь час пры сабе — не турма ж тут усё-такі.

Хлопчык тэлефануе — дзеля выгляду, няйначай, — з мабільнага начальніку аддзела аховы, супрацоўніку нейкіх таемных органаў, аматару сама меней раз на тыдзень цікавіцца ў мясцовай кіяскёркі колам чытання насельнікаў корпуса. Той быццам бы абяцае неўзабаве прыйсці, але мінае пяць хвілін, чвэрць гадзіны, паўгадзіны — ні гуку, ні кроку, ні прывітання. Паўза доўжыцца, напружанне пульхне, расце ўшыркі, згусткам нерваў захрасае ў горле, рассароджваецца па ўсім целе.

Нарэшце каржакаватая пастава мільгае ў прагалку паміж рэкрэацыяй і прыбіральняй, падае хлопчыку ледзь улоўны ўмоўны знак, прывідным ценем знікае ў скразняках неабдымнага і змрочнага, як рымскія катакомбы, будынка.

— Ладна ўжо, праходзьце, што з вамі зробіш… Але глядзіце надалей!



— Але ж і бяспамятны ты, хлопча! Няўжо насамрэч не ведаеш мяне?

— А калі і ведаю, то што? — цэдзіць абыякава ў адказ праз зубы ўладальнік амаль птушынага прозвішча і з выглядам чалавека, што дарэшты выканаў свой грамадзянскі ды яшчэ Бог ведае які абавязак, дадае: — Трэба ж было вам прадэманстраваць, хто вы тут, ва ўніверы, ёсць. А мяне сарамаціць вам не мае сэнсу, не я гэты спектакль прыдумаў, не мне за яго і чырванець. Ды мне гэтыя вашы ўсе справы, папраўдзе, — да Тэклі. У мяне размеркаванне на не абы-якую працу ў кішэні, два тыдні яшчэ адбуду тут, пры гэтых вось дзвярах, — і бывайце. Даганяйце тады з вашымі дакаранкамі-ўшчуванкамі. Свішчыце, дзядзечка, у кулак!

Гульні старыя, племя гульцоў — новае. Голас у без пяці хвілін выканальніка не абы-якой працы Койры ўпэўнены, пагляд арліны, да гульняў упаўне малады homo poscudicus гатовы.

> У гульні ў навуку немудрагелістыя, але адмысловыя правілы — з пераўвасабленнямі, зменамі роляў, неспадзеўнымі ўзлётамі ці, наадварот, падзеннямі

Нашы гульні

У абазнанасць. Калі пра тое, што дазволена Юпітэру, але не дазволена быку, — дакладна і заўсёды памятаем, а пра тое, што дазволена быку, але не дазволена Юпітэру, — заўсёды, і часцей за ўсё наўмысна, забываем.

У самотніцтва. Калі, забыўшыся ці не разумеючы, што сапраўднае самотніцтва — тое, якога хочацца пазбавіцца, усім даводзім, як мы яго, сапраўднага, толькі штохвіліны і прагнем.

У шкадаванкі. Калі, маючы пару рублёў заробку, шкадаваць пры гэтым, згодна з няпісаным законам чалавекалюбства, быццам бы павінны іншага. Таго, у каго ён — дзесяць, але яму, бач, маральна цяжка, бо здабытая тая дзясятка на дывідэнды ад хаўрусавання з д'яблам.

У дэмакратызм. Калі, дэманструючы шырыню пагляду і непрабівальны лібералізм, прылюдна падаем нядобранадзейнай асобе руку з адмыслова растапыранымі на жываце пальцамі, а агаломшаная такім неспадзеўным жэстам асоба глядзіць на тыя пальцы ды ліхаманкава вырашае, што ж з імі рабіць: ці то паціснуць, ці то плюнуць. Або калі, пазбягаючы рызыкі прылюдна пацвердзіць даўнюю і непарушную прыязнасць да апальнага грамадзяніна М., прызначаем яму спатканне пад покрывам ночы.

У выхаванне. Калі за кепскі, але негалосна прызнаны ў дадзены момант у грамадстве за ўзор учынак — падхалімства, абыякавасць, згодніцтва, хлусню — атрымліваем ад саноўных асобаў заахвочванне, а за праўдзівы, але не адпаведны згаданаму ўзору — спагнанне.

У хованкі. Калі ў слізкай сітуацыі на пытанне «Дзе ты і з кім?», памуляўшыся дзеля прыліку, адказваем: «А я і не ведаю, папраўдзе. Не тут, мабыць, і не там. Не з тым, напэўна, і не з гэтым».

У патрыятызм. (Колькасць варыянтаў і сцэнароў вядзення — бязмежная. З усіх існых гульняў самая недарэчная і, як і само слова «патрыятызм», — бадай, найболыш шкодная.)

У самасць. Калі, натыкнуўшыся ў тэксце літаратара Н. на няведамае слова або незразумелы выраз, замест таго, каб падвысіць узровень валодання моваю праз слоўнік ці даведнік, з апломбам распавядаем пра свой мізэрны клопат усяму свету, то бок грузім яго на іншых.

У навучанне. Калі на 81-м годзе ад нараджэння, уганараваныя прафесарскім званнем, раптам забыўшыся падчас лекцыі, пра што распавядалі слухачам хвіліну таму, чвэрць гадзіны ўспамінаем забытае, а пасля яшчэ трыццаць хвілін тое ўжо казанае, але неўспадзеў забытае нанова аўдыторыі даводзім-пераказваем.

У пабожнасць. Калі натхнёныя словамі Стварыцеля пра камень, які не след кідаць у бок грэшніцы, бо хто ж з нас, маўляў, без граху, самахоць адцінаем з павучання «Ідзі і ўжо болей не грашы»другую яго, нязручную для сябе, частку, блудзім другі раз, і трэці, і дзясяты, а ўволю наблудзіўшы, выходзім падчас літургіі да алтара чытаць адзінаверцам Божае Слова.

У прэзумпцыю невінаватасці. Калі, наўмысна пакінуўшы пры ад'ездзе з дому на стале для меркаваных злодзеяў пляшку разбаўленай атрутаю гарэлкі, пасля мусім да знямогі даводзіць дазнаўцам, што зрабілі гэта зусім-зусім выпадкова.

У ідэйнасць. Калі ўсюды, дзе можна, хвалім і папулярызуем прэсу афіцыйную, а тым часам кожны свой новы дзень распачынаем з гартання таблоідаў незалежных.

У моц сваяцкіх пачуццяў. Калі, віншуючы па радыё нямоглых бабу ці дзеда або кагосьці з бацькоў з іх 90-годдзем, не толькі шчасця ім жадаем, але і доўгадоўга ля весніц дома роднага нас яшчэ сустракаць, бо так нам, маўляў, выключна парадаў іх жыццёвых ды цеплыні і паху бэзу пры хаце (і нічога, баронь Бог, больш) не стае.

У шчодрасць. Калі, паабяцаўшы чалавеку пазычыць або ахвяраваць рубель, кажухам такіх акалічнасцяў тую пазычку-ахвяру няўзнак для небаракі ўхутаем, што ўжо і абяцанага рубля, а ўрэшце і самога абяцання пад ім не дашукацца.

У «дуліну табе». Калі насуперак уштуванням тых, хто пры ўладзе, што, маўляў, занадта ж лёгкі падчас дэвальвацыі — праз захаванне ў слоіку — спосаб засцярогі зберажэнняў ад даўгіх рук дзяржавы абралі, замест таго, каб аддаць тыя зберажэнні ў банк, наадварот, доведам горкім навучаныя, хаваем іх ад чужых хцівых вачэй так далёка, што і самі пасля з цяжкасцю ўзгадваем, дзе схавалі.

У «вось я табе зараз». Калі, заклапочаныя станам бяспекі ў дзяржаве, пасылаем, на ўзор спецслужбаў ЗША часоў макартызму, якія нярэдка выкарыстоўвалі для падобных мэтаў чарнаскурых, дапытваць западозраных у антыдзяржаўнай дзейнасці асобаў супрацоўнікаў шапялявых або картавых.

І г. д. — у залежнасці ад акалічнасцяў і схільнасцяў ці асаблівасцяў псіхафізічнага развіцця або стану патэнцыйнага гульца.

ВЕРШЫ

«НАМ ЧАС РАЗЛУЧАЦЦА, А РУК НЕ РАЗНЯЦЬ»

Таццяна Васільеўна ЗІНЕНКА нарадзілася 4 сакавіка 1960 года ў Казахстане. Дзяцінства правяла ў вёсцы Зачысце Барысаўскага раёна. Закончыла Зачысцкую школу, філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля (да 1994 года) працавала выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры ў роднай вёсцы і школах горада Барысава. З сярэдзіны 1980-х актыўна ўдзельнічала ў грамадска-культурным і палітычным жыцці Беларусі (выступала на першых знакавых «Дзядах»).

Пісаць пачала ў сярэдзіне 70-х гадоў. У маладосці атрымала вядомасць як аўтар таленавітых лірычных вершаў. Была ўдзельніцай семінара маладых літаратараў у Іслачы. Друкавалася ў "Днях паэзіі", рэспубліканскіх газетах і часопісах. На вялікі жаль, на пачатку 90-х мінулага стагоддзя яе жыццё, дрэйфуючы ў няпростых сацыяльных варунках, дало рэзкі крэн і паступова звялося да алкагольнай залежнасці…

Памерла 1 лютага 2011 года.

З цягам часу барысаўскія сябры, знаёмыя і калегі выдалі яе пасмяротны зборнічак паэзіі (43 вершы) помна-падаруначным накладам (50 асобнікаў) пад назвай «Плакала дзяўчынка» («Ковчег», 2013). Функцыянуе сайт памяці паэткі (www.zinenka.ru).

«Ох, як цяжка траве…»

Таццяну Зіненка, бадай, адзіную з нашых жанчын, можна пэўным чынам аднесці да шэрагу так званых «выклятых паэтаў». М. Стральцоў, М. Купрэеў, В. Гадулька, А. Сыс… і, бадай, Таццяна… Нехта не пагодзіцца, але я і не прэтэндую на ісціну ў апошняй інстанцыі. Проста ў маёй галаве інтуітыўна выстройваецца такі, лагічна выснаваны з гісторыі нашай літаратуры і яе міфаў, трагічны высакародны рад…

На вялікі жаль, але толькі скрутнасць лёсу ды ранняя раптоўная смерць адкрываюць падобныя таленты чытачу. Трагедыя жыцця спараджае пасмяротную вядомасць, а падчас і славу. Вось жыве малады таленавіты чалавек, творыць, змагаецца за светлыя нацыянальныя ідэалы і, раптам, спатыкаецца (так гэта назавём), губляецца ў жыццёвым неадназначным атачэнні ды паступова збіваецца з абранага шляху (хоць яму здаецца, што ён не здраджвае сваёй сутнасці, а толькі змяняе хаду і некаторыя метады і намаганні ў кірунку да абранай мэты). Мы ўсё гэта бачым, ды ўжо нічога выправіць не можам ці проста не хочам лезці ў чужую душу з уласнымі павучаннямі. І калі яшчэ сам той чалавек моцная валявая асоба, то ўсе нашы добрыя намеры разбіваюцца аб непрыступнасць ягонай натуры…

Так прыкладна было і з Таццянай Зіненка. Калегі і сябры, як ні наважваліся падставіць плячо і выправіць яе схібленую хаду, натыкаліся на непаразуменне. А пасля наступіла змірэнне з сітуацыяй і далейшы нястрымны інерцыйны сыход у адзіноту і самаізаляцыю… Часовы мройны хмель адводзіў яе ўсё далей ад рэальнасці. Зрэшты, паэту ад Бога ці так ужо патрэбная гэтая зашораная рэальнасць, якая пазбаўляе нас ад «палётаў у сне і на яве»?..

Пакуль, у рэшце рэшт, той высокі палёт не канчаецца трагічным падзеннем, проста кажучы — смерцю…

Хоць на пачатку, здавалася б, у Таццяны ўсё складвалася «як трэба». Ды, чым вышэй браўся голас, тым нешта знутры падказвала ёй, што трэба не так, «як трэба», а так, як душа падказвае… Воля творчага духу патрабавала ўсёй істоты… Выхаваная сваёй мудрай бабуляй старавернай, Таня Зіненка, яшчэ маладой займеўшы поспех у паэзіі, скончыўшы філфак БДУ, працуючы настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, прымаючы актыўны ўдзел у нацыянальным адраджэнні і дэмакратычных пераменах у Беларусі, — добра вядомая ў шырокіх колах свядомай інтэлігенцыі, неўпрыкмет для многіх, ураз стала «прапашчай і забытай». Здавалася, назаўжды. Але нішто існае не прападае канча. Існай сталася яе цудоўная паэзія. Яна і прабілася скрозь магільную траву… Я ўпэўнены, што заслужана і надоўга. Нам, не здолеўшым затрымаць яе ў гэтым аблудным зямным жыцці, варта хоць зберагчы яе невялікую паднебную паэтычную спадчыну. Спадзяюся, яна будзе дбайна сабрана, выдадзена асобнай кніжкай і бясстрасна ацэнена нашай крытыкай, каб, урэшце, быць годна закладзенай «белым каменьчыкам» у гістарычны падмурак нашай нацыянальнай літаратуры.

ЛеГАЛ

Фота з архіва аўтара

Таццяна ЗІНЕНКА

Пакінь мяне

Г. А.

«Нам быць з табой не выпадае
разам,
Каханы мой, ты сам пакінь мяне.
Не палічу я гэта за абразу —
Я па табе заплачу і ў труне,
Не пазбягай апошняе прынукі:
Пакінь мяне на строме пачуцця», —
Кажу табе і прасціраю рукі,
Як безнадзейна хворы да жыцця.

***

А пра маю любоў,
Якая яшчэ жыве,
Так будзе многа слоў,
Як кветак у траве.

І той, хто горш за ўсіх,
І той, хто не па мне,
Ён абярэ на міг,
Або на век — мяне.

І цяжка зразумець
Таму, хто не кахаў:
Каханне — гэта смерць.
А выжыў — дык прапаў.

***

Бабуля кажа: «Поўня ўраз саспела,
Раз'яснела, і ці не быць зіме…»
А да мяне бяссоне падаспела
І сцюжаю ўспамінаў так і дзьме…

Няма куды ад іх, упартых, дзецца,
Як ты ні бісся, сэрца, ні крычы…
Бабуля кажа: «Во й зіма
крадзецца…»
А мне б да ласкі і цяпла ўцячы…

***

Вось-вось і ліпа адцвіце,
а потым першы ліст гаротны
на дол спакойна ападзе, —
а не кажы, што мне самотна!

Сваю ўпартую тугу
пушчу на човен ветрагонны:
я і на восені змагу
сарваць свой яблык забаронны.

ВАС НЯМА

I

За гэты час, што Вас я не пабачу,
Пачнецца і закончыцца зіма…
І спадзяванні ўсе мае — дарма
За гэты час, што Вас я не пабачу.

Бо нашу ростань я не перайначу,
А верш ужо назваўся: «Вас няма».
За гэты час, што Вас я не пабачу,
Пачнецца і закончыцца зіма…

II

Няхай зіма, а я перазімую
Пад снегам журавінкаю гарачай.
І мы яшчэ сустрэнемся няйначай.
Няхай зіма, а я перазімую.

Ніколі Вы не знойдзеце другую:
Ну, хто па Вас яшчэ вось так
заплача? —
Няхай зіма, а я перазімую
Пад снегам журавінкаю гарачай…

Восеньскі матыў

Я ў цябе не першаю была.
Маладосці першыя прымары…
Што ў іх ёсць? Нязмушаныя чары,
Што прырода задарма дала.

Я ў цябе не першаю была,
Я ўздыхала восеньскаю пожняй,
І пітво гарчэйшае піла:
З-за таго, што я была…
апошняй.

Вось і ўсё

Вось і ўсё.
Адглядзелі дарма
На цябе мае сумныя вочы.
Адчуваю: вяртацца не хочаш.
Вось і ўсё.
Паняслася зямля
Пада мною кудысь ва ўтрапенні,
І навек апусцілася я
Перад імем тваім на калені.

Вось і ўсё.
І ў акно не відно
Мне цябе. І не выбегчы ў дзверы.
Засталося хіба што адно:
Ва ўсё гэта аднойчы паверыць —
І тады.. вось і ўсё. Вось і ўсё.

***

Выходзіць, я — не для сустрэч,
А для расстання?
І трэба мне збірацца прэч
Яшчэ да рання…
І я пайду. Я ўжо амаль
Кранула дзверы.
Няўжо табе зусім не жаль? —
Відаць, не верыш…

На золку певень запяе,
Нібы заплача.
І ўспомніш ты мяне, але
Не перайначыш
Мой адыход, а ў варажбе
Я, ой, слабкая.
Як не адзіная ў цябе…
Лепш — ніякая.

***

Здалець пайсці, пакуль не ўсё
сказалі
Адзін другому мы, і дзверы —
насцеж!
О, безразважнасць! Ты мне вочы
засціш, —
Здалець пайсці, пакуль
не ўсё сказалі.

Мы недарэмна гэтак пакахалі,
Бо ў нас адно здарожанае шчасце:
Здалець пайсці, пакуль
не ўсё сказалі
Адзін другому мы, і дзверы —
насцеж!

***

Мне сумна, а можа і болей.
Я бачыла Вас здалёк,
Але не прыспешыла крок.
Мне сумна, а можа і болей.

Чаму ж паміж намі ніколі
Не будзе сустрэч знарок?
Мне сумна, а можа і болей —
Я бачыла Вас здалёк…

Прадчуванне

Якая шчырая мана:
Вы — не адзін, а я — адна.
Чаго ж я ўслед за Вамі крочу,
Як быццам бы на першы злочын?

Ах, не пужайцеся дарма —
Кахання ў нас яшчэ няма.
Ёсць мой капрыз.
Ён — недарэчы!
Я дзеля Вас яго адпрэчу.

Яшчэ мне вецер не данёс
Нястрымныя патокі слёз.
Яшчэ мой позірк нерашучы
Вас абпаліў, ды не замучыў…

***

Сыдзіце з воч маіх —
я Вас амаль кахаю
за тое, што мяне
не пакахалі Вы,
а проста ля мяне
прайшлі, нібыта з краю
свайго жыцця,
не ўзняўшы галавы.

Сыдзіце з воч маіх
рашуча й памяркоўна.
Я адышла б сама, —
ды кроку не ступіць,
бо млеюць мае ногі,
як не мае ўсё роўна,
і я…
Але пра гэта
не буду гаварыць.

Прага агню

Ты не шкадуй мае лісты паліць,
Калі табе бездапаможна
хмарна —
Яны ў агонь імкнуць самаахвярна.
Ім толькі там наканавана
жыць —
Ты не шкадуй мае лісты паліць.

У тым агні я набыла радню,
З таго агню я прасціраю рукі
Не дзеля паратунку —
дзеля мукі
І прагі яшчэ большага агню,
У тым агні я набыла радню.

Дык не шкадуй мае лісты
паліць:
Вартуй агонь, каб не знікаў
дачасна,
У полымі ніколі я не згасну,
Бо я жыву, пакуль душа гарыць.
Ты не шкадуй мае лісты паліць.

***

Як хутка спыняецца наша
дарога.
Нам час разлучацца,
а рук не разняць.
Дазвольце мне Вам напаследак
сказаць:
Як хутка спыняецца наша дарога.

Бясконцая роспач мая і трывога,
Мне Вас немагчыма ніколі суняць.
Як хутка спыняецца наша
дарога.
І час разлучацца, а рук
не разняць.

ФРАГМЕНТ

ПЕРАЎТВАРЭННЕ

Фота lj mr_senokos

Анка УПАЛА

Знайдзі мяне, пакажы мяне

У другой палове дня я паехала ў Серабранку, у клуб, дзе кінааматары разам глядзяць фільмы, седзячы на падлозе, а потым іх абмяркоўваюць. Я не прагная да відовішчаў, але самота пацягнула мяне за сэрца, і я адчула патрэбу пабыць побач з людзьмі.

Серабранка — мінскі раён з нялепшай рэпутацыяй. Калі я толькі пераехала ў сталіцу, мне было нязвыкла, што ў горадзе існуе падзел на прыстойнейшыя раёны і раёны горшыя, дзе крыху больш людзей паспалітых, якія могуць начысціць чужынцу твар і адціснуць мабілу. Мне не страшна ехаць туды, бо ў Магілёве, адкуль я вядуся, агулам так, як у Серабранцы. У нас няма раёнаў для шляхты, усё заселена аднолькава, гамагенны такі людскі замес з перавагай цёмнай простасці. Ды што казаць, наша краіна збольшага такая, а я ад яе каранёў, хоць і адрозніваюся. Гэта як на целе часам вырастае лішняя пупышка — здаецца, без патрэбы, але арганізм яе не адвяргае, бо яна плоць ад плоці ягонай.

Да кінаклуба я не даехала, бо заблукала. Бываюць такія дні, калі ўсё атрымліваецца абы-як, напрыклад, аўтаматычна ты выціскаеш смятану з пакета ў кубак кавы, выліваеш яе, варыш новую порцыю, забываешся пільнаваць, і яна гарэзліва выкіпае на пліту. Або выпадае з рук і разбіваецца аб падлогу трохлітровы слоік з салёнымі агуркамі. Або ты садзішся ў тралейбус, які едзе ў няправільным напрамку і вязе цябе туды, куды твая дарога не ляжала.

Усе гэтыя рэчы здарыліся са мной у той дзень. Наагул, адразу пасля такога яскравага сімптома, як смятана ў каве, я б мусіла сказаць сабе: стоп, ніякіх важных спраў на сёння. Але я не выявіла кемлівасці, нават пасля таго, як на дапамогу самаахвярнай каве з двух'якім падвыпадвертам, прыйшоў слоік з агуркамі і недвухсэнсоўна дапамагаў зразумець. Я ж пазбірала з падлогі агуркі і шкляныя аскепкі і, выцершы анучай і адціснуўшы ў вядро расол, падумала, што мне трэба ехаць. Самота штурханула мяне ў спіну і выгнала з дому.

Гэта каля ўнівермага «Беларусь» прастора скрывілася, паказала мне язык і пасадзіла не ў той тралейбус. І я паслухмяна села і паехала, паглядаючы ў акенца. Цяпер я скарысталася б навігатарам — калі еду ў незнаёмае, уключаю яго і, як Вялікі Назіральнік, гляджу на сябе зверху, сачу, як аўтобус вязе мяне па вуліцах. Сярод ночы, калі не спіцца, магу ўключыць GPS проста так. Знайдзі мяне, пакажы мяне сярод усіх звяроў і прадметаў на зямлі. І ён заўжды знаходзіць і паказвае.

Але тады ў мяне не было такога блізкага сябра, і я заехала немаведама куды, адкуль потым паспрабавала выбрацца правільнейшым тралейбусам. Час ішоў, на дварэ цямнела, і без таго слотнае надвор'е толькі пагаршалася. Я мяшала ботамі снегавую кашу паміж безаблічных серабранкаўскіх высотак, якія здзекліва паглядалі на мае блуканні сярод іх шэрых падножжаў. Навучаны мачыхай бацька цалкам мог бы пакінуць Ганса і Грэтэль у Серабранцы — яны безнадзейна згубіліся б там з першага разу. Ува мне памёр спадзеў адшукаць дурацкі кінаклуб.

Пошукі патрэбнага дома астабрыдлі, вецер пляскаў па твары клёклымі шматкамі снегу, я стамілася і была на мяжы слёз ад прыкрасці. Хацелася дамоў ці хаця б часова выратавацца ў якой-небудзь кавярні, дзе можна адагрэцца супам. У разбалансаваным становішчы я заўжды ем суп, але нішто мне яго не абяцала, ніякіх кавярняў не траплялася. І ад бяды я зайшла ў аптэку.

Прынамсі тады я падумала, што гэта аптэка, над уваходам вісеў знак, у якім я прызнала аптэчны, праз акно я бачыла паліцы з нейкім шкляным начыннем, бутэлечкамі, папяровымі пачкамі. Зрэшты, я не збіралася нічога купляць. Узнялася на разбіты ганак і пацягнула на сябе нясвежа-белыя пластмасавыя дзверы. Унутры памяшкання гарэла прыглушанае святло ад слабых лямпаў на столі; я падумала, што ўласнік, мабыць, эканоміць на электрычнасці. Наагул тут панавала няўтульнасць, як у нашых дзяржаўных установах, хоць нічога не было разбіта ці пашкоджана. Такое адчуванне мог выклікаць бежавы колер, якім былі пафарбаваныя сцены ўнізе, як фарбуюць іх у тужлівых гнёздах бюракратыі. Я б выйшла адтуль неадкладна, калі б мне не хацелася пагрэцца і прыйсці ў сябе, а звонку мяне не чакалі серабранкаўскія высоткі, быццам гатовыя прысесці на карты. Вязаная асенняя шапка амаль не ратавала вушэй ад ветру са снегам, мне ўжо пачынала дзерці ў горле.

За аптэчнай стойкай нікога не было. З наведнікаў апроч мяне быў яшчэ чалавек сярэдняга веку з хлопчыкам гадоў васьмі, верагодна, сынам. Яны не чакалі ля прылаўка, каб штосьці купіць, а ціха перамаўляліся, стоячы перад карцінкамі на сцяне, як бы тое была галерэя. Бацька пра штосьці пытаўся, а хлопчык адказваў. Я прайшла ў іх за спінай і таксама спынілася паглядзець. Пытацца нічога не стала, не люблю гаварыць і дарэмна заводзіць размовы. Кожнае слова — страчаная энэргія, якую на пустое не варта выдаткоўваць. Карцінак было ўсяго тры, удзетыя ў простыя цёмныя рамкі з адным сюжэтам у развіцці: на белым фоне выяўляўся варсісты какос з дзвярыма і непразрыстым дэкаратыўным акном, проста акрэсленым лініяй. На другім малюнку з какосавага дома выходзіў яго жыхар, няўцямная схематычна намаляваная істота з круглаю галоўкай. На апошнім малюнку чалавечкаў было двое, адзін з іх роспачна трымаўся за шчокі ўзнятымі рыскамі, што мусілі паказваць рукі. Абодва яны нагадвалі мне моль.

Малюнкі зацікавілі і прымусілі разглядаць іх уважліва. Падалося, што я бачыла недзе гэтых істотак раней і ведала, чым яны занятыя і як жывуць. Але тое веданне нібыта забылася, і я не магла вывудзіць яго са сваёй памяці, што памнажала неспакой і нейкую разбалансаванасць, якая мяне праследвала.

Я не засталася там доўга. Крыху пастаяла, а потым пашыбавала шукаць тралейбусны прыпынак, каб вярнуцца дахаты.

Дома я скінула раскіслыя боты і вопратку, сцягнула мокрыя шкарпэткі і закінула іх у пральную машыну разам з джынсамі, калашыны якіх вымаклі і забрудзіліся ўнізе. Варыць суп не было сілаў. Я залезла ў гарачую ванну, дзе сядзела амаль да дурноты, бо надта не хацелася хварэць. Я прадчувала ўжо вайну ў сваім празяблым целе паміж нябачнымі захопнікамі і лейкацытамі, незлічоныя войскі якіх палягуць, абараняючы сваё жытло. Перад сном я запарыла здрабнёны корань імбіра, дадаўшы мёду і распушчаны ў цёплай вадзе пакет вітаміна С. Адправіла гэты правіянт унутр сябе, каб падтрымаць войска сваіх абаронцаў. Часам такі фокус дапамагаў мне ў самы апошні момант.

Тае ж ночы ў мяне ўзнялася тэмпература. Прастуда ўчапілася ў грудзі драпежнымі пальцамі ведзьмы. У горле непрыемна шкрэбла, як бы я праглынула лапуховыя калючкі, што ў нас завуцца дзядамі і якімі мы шпурляліся ў дзяцінстве, каб яны ўчапіліся ахвяры ў валасы ці прысталі да адзення. Гэтыя калючкі напраўду нагадваюць сівыя дзядоўскія галовы з кудлатымі барадамі.

Пераўтварэнне

— Я хачу быць, як Капітан, хачу пайсці па дарозе.

— Мы не таго гатунку, сын, каб ісці. У нас іншае прызначэнне. Агледзься, ці ты бачыш нейкую дарогу? Няма нічога. Ёсць толькі мы і наш дом.

***

Сын увайшоў у цёплую ваду і лёг на спіну. Вада трымала яго лёгкае маленькае цела. Ён заплюшчыў вочы і гайдаўся на хвалях, як нежывы. Паступова яго вынесла на сярэдзіну возера.

Невядома, колькі ён там знаходзіўся, але аднойчы час выйшаў. Сынава цела прачнулася, выбухнула пупышкай, пачало расці, імкліва выціскаць прастору вакол сябе. Хутка яно заняло сабой усё возера, больш не змяшчалася ў яго; ногі, рукі, жывот, галава — кожная частка цела зведала змены, узбуйнілася і змяніла форму. Скура зрабілася пурпуроваю, выраслі грудзі. У вадзе цяпер ляжала жанчына, вялікая і жыццядайная. Яна спачывала спакойная і новая, нагамі і галавой упіраючыся ў ілістыя берагі. Жоўтыя трубчатыя расліны калолі яе ступні. У доўгіх цёмных валасах, як у водарасцях, шворыліся маленькія рыбкі.

Жанчына расплюшчыла вочы і ўзнялася.

***

Бацька бег за ёй, губляючы сілы, вязнучы ў пыле, вільгаць з вачэй пакідала дарожкі на твары. Спрабаваў ухапіць яе за нагу, рызыкуючы быць расціснутым велізарнай ступнёй.

— Стой! — дыханне хапіла толькі на адно кароткае слова.

Ягоны галасок згубіўся ў рухомых сферах. Немагчыма, каб там наверсе яна пачула ягоны адчай — гора засталося незаўважаным. Яна сыходзіла назаўжды па дарозе, што выпрасталася перад ёю.

Бацька адчуў, што не можа больш бегчы, і ўпаў, апёкшы калені і далоні аб нованароджаную гарачую зямлю. Пурпуровая жанчына спынілася і павярнулася, каб агледзецца, ледзь не наступіўшы на штосьці непрыкметнае для яе.

Паўсюль, дзе раней была белая пустэча, паўставалі бяскрайнія бледна-зялёныя ўзгорыстыя палі, паўз якія сцяліліся ў розныя накірункі жоўтыя дарогі. Усё змянялася, і зменам не было канца. Але абрынаўся толькі стары свет. Паўставаў новы, невядомы. І гэта і не добра і не блага.

***

Бацька сеў на ганку і сцішыўся, пусты і самотны, навокал выраслі дрэвы, паўставалі пагоркі, разгортваліся дарогі, пульсавалі былыя нябачныя рэкі і з'яўляліся новыя. Так ён сядзеў доўга, потым увайшоў у дом, дзверы замкнуліся. Ён засне зноў і будзе спаць, чакаючы, пакуль не прыйдзе зіма і не супакоіць ліхаманку новага свету. Яна засыпле жоўтае, зялёнае, пярэстае белым. І свет забудзецца пра сваё нараджэнне і заглыбіцца ў сваю існасць, задрэмле, будзе адпачываць. І сон бацькі, як падмурак, будзе трымаць яго. Гэтак жа, як ён трымаў мінулы свет, ужо забыты, ужо няважны. І гэта не добра і не блага.

***

І я тут, і я тут, але дзе маё цела? Якое страшнае пачуццё, калі ты нават не страціла памяць, а наадварот, памятаеш і ведаеш празмерна многа. Зашмат для мяне адной, хопіць на некалькі чалавек. Дзе мая існасць? Якія рукі мае, якія вочы, якая роля? Гэта мая галава празрыстая, праз мяне прасвечвае сонца? Я знаю гэты дом, я там спала, як у кокане, я разбурала і я сыходзіла, гэта я плакала, я бегла, я не магла ўтрымаць, я страціла, я супакоілася, я заснула. Я бацька і я сын. Гэта я падзялілася на два і зноў заснула зернем у доме.

***

Ноч і наступны дзень я праляжала ў ліхаманцы, то засынаючы, то прачынаючыся, мокрая ад перападаў тэмпературы, якую збівала лекамі. Цяжкая галава адмаўлялася думаць, нос не дыхаў, вачам было балюча глядзець у кампутар, і мяне хапала толькі на тое, каб запарваць і заліваць у сябе гарачую гарбату. Мне сніліся нейкія складаныя сны, якія я забывала, прачнуўшыся. Памятала толькі, што я калыхалася ў цёплай вадзе і спрачалася з кімсьці, хто мяне не разумеў.

ВЕРШЫ

ДВОЙЧЫ Ў АДНОЙ РАЦЭ

Алесь КАСКО


Фота А.Ганчука

Разгубленасць

Вітаць усход сонца? Усход над сталіцай
насуплены шчыльнаю хмараю.
Узірацца ў будынкі? Яны
нагадваюць фрэнчы вайсковыя.
Услухацца ў салаўя? Абуджае
пошчак шчытоў і шчоўканне гумы
рэхам, не выветраным часам.

Газеты гартаць? У іх алілуйшчына,
як палімпсесты на некралогах.
Сотавік сябраў набраць? Блакаваны:
раптам пачуюць трэція вушы.
У сквер Купалаў падацца? Там
паэта няма, блукае над Свіслаччу,
над ракою жыцця замутнёнага.

Так і стаю на гаўбцы гатэльным,
абкурваю думкі, бы пчолаў, і ўсё-ткі
ў чаканні гляджу на праспект —
невядома чыёй — Незалежнасці:
вось-вось паявяцца белыя вершнікі,
паклічуць мяне з сабою
ці пранізжуць пагардлівай дзідаю.

Навагодняе сола

Мікалаю Аляксандраву

Не круіз, не мыс, не ўзмор'е,
ды ўскруцілася надвор'е:
золь і шторм! І сеў на мель
горад, быццам карабель.
Нізкаверха, крывабока,
з мігаценнем мокрых вокан
б'ецца ў шквале слюдзяным.
Мітусіцца сцяг над ім.
Голай палубаю плошча
раскалыхвае, палошча
елку-мачту. Дождж ілье,
і ў яго сівой імгле
з праблiскам святла сляпога —
ні стырна, ні стырнавога.
Толькі хісткая адна
постаць нечая відна.
Гэты нехта сам святкуе,
і блазнуе, і танцуе,
і гукае, бы вар'ят, —
зычыць свету добрых свят.
Гэты нехта непрытульны
дураслівіцца, пакуль не
пойдзе спаць ці піць віно,
ці апусціцца на дно,
ці трубу з нябёс пачуе
ды ў псіхарні заначуе…
Аднаму — усё адно!

Паэты-эмігранты

«Птушкі ведаюць гнёзды свае…»
Ф. Скарына

Пэўна, і ў выраі гнёзды свае…
Родным прасякнуты духам,
птах не адзін па-крывіцку пяе
блізка й далёка за Бугам.

Кожны з іх ведае шлях свой назад,
вучаны доляю сведкаў:
вось прыляціш — а твой ссечаны сад,
а замест гнездзішча — клетка.

Род будаваўся тут сотні гадоў,
ды па галінцы, пярынцы
ўсё расцягнула гурма груганоў,
нелюбаў песняў крывіцкіх.

Так! Як апрыкрае ростані смак,
прагнуць вярнуцца хоць позна
птахі, сагнаныя з гнёздаў, аднак —
ці ж да спаганеных гнёздаў?!

Апакаліпсіс

(пасля аварыі на Беларускай АЭС)

Мне прыснілася восень жуды:
мы палыннымі зоркамі сталі,
а на котлішчах, як і заўжды,
за сталамі паселі Дзяды,
што жывых не засталі.

Ні хлябоў на сталах, ні вады;
запытальна ўзіраюцца ў далі, —
там ад спёкі згараюць сады,
там чарнееца знакам бяды
атам на п'едэстале.

І прыснілася, што праз гады
(продкі ў міг іх адзін спрасавалі)
мы, палынныя зоркі, сюды,
мы, тлен і попел, нат на клады
прылятаць перасталі…

* * *

Няшчырыя мы нават у канцы,
калі ў жалобе тоўпімся над мёртвым,
калі канонам векавым і цвёрдым
вядуць хаўтурны спеў над ім айцы.

Скрыпіць аркестр натомленым акордам,
а мы, на цёплую слязу скупцы,
уласныя сардэчныя рубцы
перабіраем у маўчанні гордым.

Усцешна: размінуліся з чаргою,
не роўня нам паніклы галавою,
што і прапойцам слыў, і хліпаком…

Дык ён, калі б ажыў хоць на хвіліну,
сам прыпляскаў бы вечкам дамавіну
і сам, каб мог, прысыпаўся б пяском.

Вуліца

Святочныя, як лісце бабінага лета,
умытыя, як вокны ранішніх дамоў,
на шпацыры выходзім — і здаецца,
што бесклапотныя мы ўсе, нібы нядзельны
дзень.
За пудравым пылком схаваліся маршчыны,
за бляскам сонца — цьмяны сум вачэй;
яднае, роўніць нас суцэльная стракатасць,
размытасць руху ў мностве рук і ног.
Нас нівелююць падсвядомыя памкненні
прыняць за яву мройнасць, страх
прыўзнясць
ці скінуць хоць на момант павалоку свята,
да ўласных мулкіх згадак чужыя далучыць.
Не, нам высокае бліжэй — з птушынага
палёту
або з падробленых гірляндаў на слупах
натоўпы сузіраць, — адтуль,
адкуль не можам
сляпому кій падаць, а ўпалага падняць.

Ашуканы

Заблукаеш у парк уночы
мякка, моўчкі, амаль па-воўчы
і баішся ў кулак завыць,
цішу горада разбудзіць.
Спіць твой горад за сінім змрокам.
Хай паранены ты глыбока,
ды прымроіш — нібыта зноў
ты вярнуўся і сам дамоў,
і нібыта цябе з кватэры,
распрададзенай да шпалеры,
не выцкоўвалі махляры…
Іх спаткаеш на цвінтары.
Як падкажа твой вопыт скрушны,
што не трэба ім лезці ў душы, —
учарашнія крыўднікі
не абыдуць тваёй рукі.
Будзеш подаўкам іхнім рады
і ні разу не ўсхрыпнеш: г-гады! —
не падступішся ні на крок
ды не зыркнеш на іх, бы воўк;
кінеш позірк на крыж царкоўны,
позірк ціхі і памяркоўны…
Яны ўпэўняцца: беларус.
Яны возьмуць цябе ў хаўрус.

Двойчы ў адной рацэ

Ад спёкі на сэрцы ўцёк да ракі,
на бераг бязлюдны; вада заняпала,
ды з кожнаю хваляю ўпарта прыносіць
мне бацькавы скаргі на адзіноту,
за тыя хвалюецца, што засталіся
на дне пацямнелым, заіленым.
Паблісквае водмель слязінкамі маці,
якіх я не бачыў калісьці, заглыблены
ў сябе, або ў кніжкі, або ў далягляды, —
і позна сціраць іх ражком аблачыны.
Затока пад трыснягом і гарлачыкамі
плюскоча гамонкай, пазвоньвае чаркамі
сяброўскіх вячэрняў, тады абыякавых
да трывог, што таіліся ў нас паасобку.
У сінім віры, куды зазірну выпадкова,
люструюцца вочы тваe неспакойныя:
няўжо і па сёння ўзаемнасці прагнуць?..
Хвалюецца кожнаю хваляй вада,
я ж думаў — сплыла даўно й назаўсёды.

* * *

Асліплены ясным прыцемкам,
слыху пазбаўлены цішынёю,
абпалены жаўталісцем,
прыцягнуты даляглядам —
спыніўся ў разгубленасці:
чаму гэтак шмат — аднаму?

Сябра не падыму, а каханай
не дагукаюся: я даўно ўжо
за межамі яе чуйнасці…
Быў бы падарожнаму рады,
ды хто за спінаю — не прычакаю,
хто паперадзе — не дагану.

Збочваю да сябе, і праводзяць
зноў ачунялага ад ілюзій
дарога бязлюдная, вецер
ды астылае харавство,
душой не спажытае без жалю,
бо нашто яно — аднаму?

* * *

«Сёння ў нас выпаў першы снег», —
паведаміла ты праз «электронку».
Астатняе, недапісанае, сам уяўляю:
цябе з першаснегам віншуе ён,
хто набыў у аранжарэйшчыка ружы;
ім, беласнежным, ты радуешся так,
бы калісь маім падснежнікам…
А ў нашым горадзе не жыве тая,
што магла б мяне павіншаваць
і каго павіншаваць мог бы я.
Таму і няма ў нас снегу.

Фота А. Х.

НАТАТКІ

ГАЛАВА І ВАЛАСЫ

СТАРОНКІ З ЗАПІСНЫХ КНІЖАК (1960–1988)

Анатоль КУДРАВЕЦ

Падумаў пра старых пісьменнікаў, пра тое, што часта яны пішуць слабей і слабей. Падумаў пра старасць, і ўспомніліся дзяды, што сядзелі на прызбах і плялі лапці. Не перашкаджайце старым плесці лапці!.

Сеў за стол, пісаць. А што пісаць? Пра што пісаць? Пра тое, што пачаў баяцца спаць? Што страх пачаў скоўваць усяго — і днём, і ноччу, асабліва ноччу. Што кожны стук аддаецца нажом у сэрца. Што страшна паміраць і што паміраць трэба? Што ўрэшце рэшт усе вялікія праблемы зводзяцца да лакальных — хлеб, дзеці, жонка...

У лесе восень ідзе знізу, на лузе — зверху. Адцвілі, пачарнелі галоўкі дзяцеліны, пачала чарнець асочка і мятлюга, адцвіў даўгашчокі люцік.

Куравыя вочы дыму не баяцца...

Да бяды вельмі мала трэба...

Я ў вас у кожнага ў мордзе пабываў...

Дрэнная тая курыца, што ад сябе грабе...

Каб цябе нямножыла (на каня).

Калі не поп — не ўбірайся ў рызу.

Гаўно застанецца гаўном, нават калі яго падняць на Эйфелеву вежу.

Люлі, люлі, дзіця спаць, адна маці, бацькоў пяць.

«Што гэта за дрэва, на якое птушкі не садзяцца»,— сказаў Піцераў зяць, калі яму сказалі, што да яго Нінкі хадзіў Міша Аляксееў, калі зяць быў у Карагандзе.

Затрашчаў, зашуршэў гром, быццам пасыпалася жарства.

Думы пра жыццё. Яны разрываюць галаву. Часам здаецца, што чэрап не вытрымае і лопне, разваліцца на часткі. Ён ужо развальваецца, і трэск яго раздаецца ўсюды. Нават калі б зямны шарык раскалоць на дзве часткі — атамных і вадародных бомбаў ужо накоплена больш, чым на гэта, — то ён не трашчаў бы так моцна. Здаецца, што баліць не мозг, а месіва, тое, што лічыць сябе мазгом.

Ігнат Дуброўскі: «У кампаніі немагчыма не піць. Адразу адстаеш у настроі, і, лічы, вечар сапсаваны...».

На веранду заляцела сінічка. Лётае, б'ецца ў шкло. Прынёс стул, злавіў яе: хай адагрэецца. Прынёс у пакой. Зноў пачала біцца ў шкло, потым прыціхла. Гляджу — ляжыць каля шафы. Ножкі ў павуціне, выцягнутыя назад, пярынкі растапыраны, а пярынкі лёгкія, далікатныя — адзін пушок. На галаве жоўта-ружовая палоска, дзюбка вастраныкая, сціснута, вочы — дзве канопліны, затуманеныя. Ляжыць нежывая. Памёрла. Ці ад голаду, ці пабілася. Вось і адагрэў.

Мяллян мяккі, куды пахінеш, туды і гнецца. Мяккі — то не скора пераломіцца.

Раніцай зайшоў у рэдакцыю Андрэй Кукевіч (журналіст). Яго прыход мяне ўзрадаваў. Даўно не бачыліся, ды і не было нікога з хлопцаў, з кім можна было перакінуцца словам-другім, — работа, работа, работа...

Андрэй і сказаў, што Толю Сербантовіча ўчора забралі ў Навінкі. Навінкі, псіхі. Навіна гэта была для мяне не надта нечаканай. Учора, роўна ў гэты час, я пачуў на калідоры Толяў голас. Выйшаў. Павіталіся. Голас у яго быў надта моцны. Ён гаварыў так, быццам перад ім стаяў глухі. Я зірнуў яму ў вочы — і мне стала страшна. Вочы былі з мутнёным прысадкам. І бегалі, як заведзеныя. Я збег — спачатку ў рэдакцыю, пасля на вуліцу, пасля ў кавярню. Андрэй расказваў, што Толя гаварыў пра тое, як яго выключалі з універсітэта, з камсамола. Як за ім нехта гнаўся. Толя быў упэўнены, што гэта быў кадэбэшнік... А ўвогуле, ён хоча мяняць кватэру... Ён так хадзіў па калідоры да канца работы, а потым яго забралі. Не ведаю, як там апынуўся Кукевіч, але ён сказаў, што доктар сам яшчэ нічога не ведае, баіцца, што гэта ціхае памяшанне.

А мне ўспомніўся Толя яшчэ маіх студэнцкіх часоў. Было, ён з месяц жыў з намі ў адным пакоі. Прыходзіў заўсёды выпіўшы і заўсёды, калі ўжо ўсе спалі. Ціхенька клаўся, а ранічкай, калі ўсе яшчэ спалі, падымаўся і ўцякаў. Адзін раз я ўсё ж устаў раней за яго і паспрабаваў прачытаць яму «мараль» пра ягоныя паводзіны. Ён не спрачаўся, неяк бегла прагаварыў: «Добра, добра, я буду іншым» — і пабег. Вядома, «іншым» ён не стаў...

Заходзіў Сцяпан Гаўрусёў. Паздароўкаўся, як заўсёды, з усімі за руку. Пайшоў — таксама падаў усім руку. Было нешта сумнае і ў яго прыходзе, і адыходзе. Пакамечанае старое паліто, сутаргавае торганне шчакі, стомлены і жаласлівы, быццам хацеў падбадзёрыцца, голас, калі гаварыў па тэлефоне з жонкай і сынам. Ён гаварыў па тэлефоне, калі нехта сказаў, што памёр Глебка. Паклаў слухаўку: «А я ў яго сто рублёў пазычыў. Як яму цяпер аддаць? На магілу занесці? Ці жонцы? Пайшоў чалавек і думаў, што я яму не аддаў...». У голасе ўсё тыя ж сум і стомленасць.

За столікам у кафэ «Маладзёжнае» прыселі два мужчыны: адзін — гадоў на 40–45, другі гадоў на трыццаць. Старэйшы — з прыгожым, нездаровым, ці стомленым, ці хваравітым, тварам. Гаворыць. Відаць, звольнілі з авіяцыі, быў лётчыкам, жыў у Тушына.

— Усё ёсць: чатырохпакаёвая кватэра, «Волга», добрая пенсія, а цягне лётаць. Раней, малады, я не разумеў гэтага. Гаворыць: цягне ў мора, а нельга. Нельга, значыць, і не павінна цягнуць. Ці лётаць. А цяпер сам адчуў. Выязджаю на шашу, машыне па самую плешку, колькі яна там — сто сорак, і мала. Жонка кажа: «Я з табой нікуды не паеду. Ты як шалёны». Ляцеў неяк у Данбасе, у самалёціку. Маленькі, чатырохмесны, чэшскі. Яны не прыжыліся ў нас. Былі мы ўдвух. Прашу лётчыка: «Братка, зрабі пятлю».

Ён глядзіць на мяне як на дурня.

— Зрабі, — прашу. А ў грудзях так падпёрла, хоць плач. Дастаў з чамадана бутэльку рыжскага бальзама, даю: «Зрабі, будзь ласкаў».

Пагладзеў ён, пагладзеў на мяне — і крутануў адну пятлю. І ў мяне як быццам адлягло ад сэрца.

Радня — ад рабой каровы каўбух.

Лёс бацькоў і братоў.

Бацька, Шпак Герасім, мамін брат, загінуў на фінскай вайне, маці год перад тым памерла ад туберкулёза. Дзеці — Міша, пяць гадоў, Валодзя, два гады, засталіся з дзедам Іванам і бабай Аўгінняй. Незадоўга да вайны рашылі здаць дзяцей у прыют, у Бабруйск. Вяртаўся, даехаў да Асіповіч, і пачалася вайна. Група, у якой быў Міша, пеша ішла на ўсход. Недзе іх падабрала машына. Завезлі ў Казахстан, і там бяздзетны палкоўнік забраў Мішу, усынавіў, даўшы сваё прозвішча — Сініцын.

Валодзю разам з меншымі дзяцьмі везлі на машыне. Наляцелі самалёты, іх разбамбілі. Нейкая жанчына, Валодзя думаў, што гэта маці, а то была выхавацелька, несла на руках дзяўчынку. Валодзя бег след. Паказаліся немцы. Жанчына, не аглядваючыся, пайшла ў лес. Валодзя заплакаў. Вывальваючыся з машыны, ён вывіхнуў руку. Яго падабралі немцы, пасадзілі на падводу, завезлі ў нейкую бальніцу, управілі руку. Пасля яшчэ прыходзілі, прыносілі цукеркі, потым завезлі да нейкай бабы, сказалі: глядзі.

Яна і глядзела. Сваіх трое, Валодзя чацвёрты. Прыйшла Чырвоная армія, жанчына завезла Валодзю ў дзіцячы дом. І там, ужо ў шостым класе, Валодзя сустрэўся з хлопцам, старэйшым гады на тры. Той і гаворыць: «А я цябе ведаю. Ты з Дзмітраўскага сельсавета Клічаўскага раёна».

Валодзя паслаў запыт у Клічаў. Прыйшоў адказ: Пруднікавых у раёне няма. Пруднікаў — Валодзя сам сабе выдумаў прозвішча, свайго, Шпак, ён не помніў. Потым было ФЗА, Камсамольск, армія. Паслаў зноў запыт у раён. Сарока з ваенкамата аб'ездзіў увесь раён — Пруднікавых няма. Прыслаў адказ: «Дайце яму водпуск, хай сам прыедзе».

Прыязджае. Паехалі ў Дзмітраўку, сабралі старэйшых жанчын. Адна з іх паглядзела на Валодзю і кажа:

— Нікога, хлопчык, ты не шукай, а ідзі ў Аколіцу, там жыве твая цётка, а другая ў Максімавічах. Ты Любін і Герасімаў сын.

Валодзя пайшоў у Аколіцу, знайшоў цётку Аксеню, яна прызнала яго за радню. І вось доўгая ноч у цёткі. Назаўтра ён гаворыць:

— Можа, цётка, я ніякая не радня вам, вы прызналі мяне па дабраце. Пайшлі ў Максімавічы, да цёткі Веры.

І там яго прызналі.

Радню знайшоў. Заставалася знайсці брата.

Паехаў даслужваць і шукаць брата. Служыў на падводнай лодцы. Лодка выйшла ў мора і не вярнулася. Брат таксама дамоў не вярнуўся, у турму трапіў. Згінуў.

Вось і ўся сямейная біяграфія.

Трагедыі бягуць за намі. (Выкінулася з балкона (8-мы паверх) Жэня Янішчыц).

Пляменніца Георгія Булацкага з маленькай дачкой ішла якраз па двары і бачыла, як лёгкай птушкай мільганула з балкона ў раскрыленай адзежы чалавечае цела. Страшна глядзець, як мёрзлая зямля ляціць насустрач жывому трапяткому чалавеку.

Гук удару і адчуванне жаху, што ўжо нічога не зробіш, ёсць нешта спакойнае, абыякавае, раўнадушнае да ўсяго на свеце і да таго, што адбылося з ім — чалавекам.

Аптыміст Маякоўскі пайшоў следам за песімістам Ясеніным, зрабіўшы ўсё, каб даказаць перавагу аптымізма над песімізмам. Не даказаў. І гэта не проста факт гісторыі, факт веку, факт пастаянства.

Я думаю, што Жэня Янішчыц шмат разоў стаяла перад адчыненым вакном, перш чым зрабіць свой апошні страшны крок. Яна не ведала страху і не ведала цаны свайго страху. Можа, яна думала, што балкон — тая ж мяккая, тонкая кладачка, што адкрыла ёй дарогу ў паэзію, у свет прыгожых ілюзій. Там была кладачка над ручлай, яна была тонкая, хісткая, але свая, зямная. Як усё зямное, кладачка ўмела жартаваць. Бетон жартаў не любіць, не разумее. Ён крышыцца, а не гнецца.

Я пакінуў Анюту дома, а сам пайшоў у магазін. А каб яна не баялася пабыць адной — хай глядзіць у вакно. Я толькі прайду ў магазін туды-сюды. Вакно я ўзяў на зашчэпку: думаў убачыць мілы тварык за шклом.

Праз пяць-шэсць хвілін выйшаў з магазіна, зірнуў на вакно і ўбачыў, што яно расчыненае. Відна была лямпа, што чорным сілуэтам стаяла на падваконніку, а там, дзе павінен быў быць тварык унучкі, была расчыненая створка. Дзявяты паверх...

Не памятаю, як я ўскочыў у ліфт, як адамкнуў дзверы... Сустрэла сама Анюта:

— Я цябе шукала, а цябе не было...

— Я ж махаў табе рукой...

— Цябе не было...

Створка вакна сапраўды была расчыненая. Але ж я перад выхадам узяў яе на зашчэпку.

Старшыні прыходзяць і адыходзяць, а бухгалтары застаюцца.

Захварэў на грып. Тэмпература невялікая — 37,2, але ломіць косці, выкручвае ногі, кашаль, слабасць. Ляжыш — здаровы, устаў — ногі дрыжаць, сам дрыжыш, як пасля страшнага перапою...

У каторы раз гляджу на Любу — такая далікатная, чулая, мяккая, простая.

Ёй радасна лячыць, даваць лякарствы, ставіць гарчычнікі... Не пазнаць жанчыну — быццам трапіла ў сваю стыхію. Думаю: прападае такі педагог, ці доктар, ці дзіцячы кіраўнік...

«Не выступай...» — лозунг часу. Нават Вера на Паўла гаворыць: «Не выступай, Паўлік». Веры — дзевяць, Паўлу — чатыры.

Масіўны, шыраказады, з мяккім жаночым тварам і нечакана звонкім бабскім голасам, ён хадзіў шырокімі плывучымі крокамі, нахіляючыся наперад, быццам на плячах у яго быў мех пудоў на пяць, і ён увесь час баіцца, каб самога мех не павёў убок.

Ён чэпка і моцна браўся за край кафедры, нібы яна была яго ворагам і ён зараз скрышыць гэтага ворага.

Зацвіла вішня. Адламаў галінку. Пах сухога перагарэлага сена — душны, сухі, перхатлівы.

На базары. Жанчына прадае бэз.

Пакупніца:

— Што вы, ён жа ўвесь асыпаецца.

Прадаўшчыца:

— Што ж тут такое. Галаву чэшуць — валасы сыплюцца, галінкі ломяць — пялёсткі сыплюцца.

— Пакуль зязюля не закукуе, лягушка не будзе турчэць.

— Каб цябе людзі аббягалі.

(З пісьма з піянерлагера). Добры дзень, мамачка. Мне тут добра. Толькі пуцёўку другі раз не бяры.

На тым месцы, дзе некалі стаяў манумент Сталіну, густа зазеляняла трава. Прабілася ў пазы паміж каменнямі, стварыўшы роўны, ярка-зялёны квадрат. Як напамін тым, хто нешта помніць.

Павел:

— Адзін людзь сказаў аднаму чалавеку…

Глядзіць на неба. Там пачаўся месяц.

— Ой, як гарбуз.

— Ага, нехта адрэзаў.

— Няпраўда, такой лесвіцы няма.

— Якой?

— Каб дастаць да неба.

Аповесць пра тое, як ён не любіў сваю жонку, ён та і жаніўся на

ей з-за жаласці, пашкадаваў, ды і самому не было куды дзецца. І вось сколькі гадоў жывуць, пайшлі дзеці. Раней было нішто, нешта звязвала, можа, тая маладосць, а далей усё больш раздзяляе. Раней яго цягнула нейкая рамантыка, і яна ішла насустрач, здавалася, яна была рамантычнай асобай, а калі не рамантычнай, то добрай, звычайнай, сямейнай. Потым быццам нешта адбылося, кожнае яго слова яна пачала сустракаць у штыкі, і ён таксама. Ён уздрыгвае ад кожнага яе слова. Відаць, сабака так гірчыць на голас нелюбімага чалавека.

Ён бачыў, што яго не любяць, ды і сам ён па-сапраўднаму не любіў. Сабраліся розныя людзі, якія не ведалі, што ім рабіць і з сям'ёй, і з дзяцьмі, і з самімі сабой.

Ён хутчэй за ўсё эгаіст. Яна — добрасумленная самка, якой не далі месца і часу для самаразвіцця. Ёй трэба было любіць дзяцей, а тут яшчэ іншая работа — і мужык, і зарплата.

Мужык... ён адчуваў сябе то скацінай, то папрашайкай, то чорт ведае кім. Спаў, калі іншым не спалася, не спаў, калі ўсе спалі.

Бялее позняя ноч. Можа гадзіна, можа дзве. Натужна равуць машыны, рэдкія. Відаць, шафёры спяшаюцца дамоў. Ім ёсць куды спяшацца. А яму няма куды, ён дома, ляжыць у сваёй пасцелі. Толькі што пайшла ад яго жонка. У другі пакой. Да дзяцей. Ёй там спакайней. Будзе ляжаць і спаць. Радавацца, што ніхто не дакранецца да яе бядра...

Гудзе самалёт, недзе, як у вайну. На сцяне два белыя фламінга. Ім добра, яны ўдваіх…

Чаму вельмі часта наш жыццёвы тонус ствараюць жыцейскія дробязі. Не тое галоўнае, што робіш ці стараешся рабіць ты, а мішура, мурашнае капашэнне. Непрыбраная пасцель, непамыты посуд на кухні, раскіданыя ўсюды прыколкі, трусы, панчохі... Здавалася, чорт з імі, а засядуць у галаву, у нутро, і мурашкі паўзуць па целе. Відаць, і ў сям'і павінна быць нейкая важная аснова. Можна цярпець адзін аднаго, а жыць немагчыма.

Пра характары: яны занадта паралельныя, каб перасекчыся і высячы іскру.

Андрэй Кавалёнак. Аколіца: «Вапшчэткі, я б і зубы сабе вытачыў, метала нет». І гэта праўда: ён бы вытачыў.

Не косіць, а галосіць.

Матаюся як чорт. Праз два дні здаваць дыямат, а я яшчэ нават Афанасьева не адолеў. На рабоце Іна злуе: мала сяджу над пісьмамі. А што можна зрабіць за тры гадзіны? Да пяці працаваў над пісьмамі, да васьмі ў ленінцы, а там зноў у рэдакцыю — дзяжуру. Добрае за ўвесь дзень — «бульбяная», гаршчочкі і піражкі. Пасля адзінаццаці з Любай. Ішоў снег. Рукі былі занятыя, нельга было нават пацалаваць. Пры развітанні яна сказала, што дрэнна падлізваўся.

Са збана можна выліць толькі тое, што ў ім ёсць (арабскае).

Ад жорнаў уцёк, ды пад прэс трапіў.

Невуку даруюць і семдзесят памылак, а вучонаму — ніводнай.

Голас, як барабан: гучны і пусты знутры.

Па тратуарах весела несліся белыя хвасты пазёмкі.

Полымя ўзаемнай дружбы можа гарэць, калі яго падтрымлівае жар агульных інтарэсаў.

Былі Кажушковы — усе ўтраіх. Гена расказаў некалькі цікавых гісторый.

Чалавека перастрэлі каля дома трое:

— Здзявай штаны.

Ён падумаў: старыя штаны, аддам.

Здзеў, узняўся на другі паверх і ўспомніў, што ў штанах 35 рублёў. Бягом назад. Зладзеі не паспелі далёка адысціся.

— Давайце назад штаны.

Зладзеі ўцякаць, ён даганяе. Насустрач машына з міліцыяй. Тых траіх прапусцілі, а яго забралі: чаму без штаноў?

Пакуль тлумачыў, што ды як, зладзеі зніклі.

Студэнты рашылі пажартаваць над сябрам. «Пайшлі, ёсць справа!» Вадзілі, лазілі па дварах, цераз платы, таямніча сабраліся. Ёсць што? Нічога, нейкія капейкі. Толькі ты нікому ні слова...

Праз тыдзень: табе прыйдзе тэлеграма. Першыя дзве лічбы — нумар дома, дзве другія — кватэры, наступныя — час, калі трэба рабаваць.

Сабраліся. Адкрылі кватэру — гэта была кватэра аднаго з хлопцаў. Сабралі шмоткі. Ты глядзі грошы. Знайшлі 40 капеек. Далі яму вузел. Ён схаваў, закапаў. Пасля сказалі: адзін з нашых засыпаўся. Ён ноч не спаў, а назаўтра прыйшоў у міліцыю...

Для здаровага чалавека дзяўбанне дажджу па бляхе за вакном — музыка, для хворага — пакута.

Учора купіў тры тамы пісем Някрасава (10, 11, 12) за 60 капеек. І добра, і здарова, усяго за паўтары шклянкі бяздарнага віна.

Чалавек заўсёды знойдзе месца памерці.

Дзяцінства багатае памяццю. Памяццю на ўсё. А асабліва памяццю на пахі і на смак.

Ніколі не забуду, як пахла і які смак мела белая булка, якую прывёз бацька з Бабруйска. (Яны з мамай прадавалі мяса і сала заколатай свінні, каб сабраць грошы на карову). Толькі адзін раз, ужо ў трынаццацігадовым узросце, у Мінску, давялося мне з'есці такую смачную булку. Яна на нейкае імгненне ажывіла тое далёкае адчуванне і тое колішняе шчасце.

Ніколі не выветрыцца смак галандскага сыру, якім пачаставаў Надзін Геня, яны атрымалі яго з Амерыкі, на забітага бацьку.

На плошчы Якуба Коласа ўстанаўліваюць помнік. Кожны дзень то хаджу, то езджу паўз яго. Вельмі прымітыўная трактоўка пісьменніка. Не трэба было садзіць пісьменніка, гэта сядзячая постаць яшчэ болей адцяняецца скульптурнымі групамі — музыка, дзед Талаш. Ёсць масіўнасць, велізарнасць, няма ўнутранага, духоўнага адзінства. А тут яшчэ гэтая правая рука, якая завісла паміж падбародкам і грудзямі.

Часта думаю пра Купалу і Коласа. Купала ўлавіў, паказаў дух беларуса перад рэвалюцыяй 1917 года, дух бунтарны, неспакойны, трывожны. Ён вылучыў яго з натуры беларуса і паказаў усяму свету.

Колас паказаў натуру беларуса, яго душу, яго сутнасць. Натура — з'ява больш складаная. Яна больш вечная, больш гнуткая, яна мяняе абалонку, пакідае сэрцавіну, яна можа ісці з часам, можа легчы на дарозе ў яго, яна жыве разам з народам і памірае разам з ім. Вось у чым агульнае і рознае ў Купалы і Коласа, і калі Анікейчык улавіў у сваім цудоўным помніку Купалаву душу, Азгур не ўлавіў. Яго купіла знешняя прастата Коласа, за ёй не ўбачыў маштабнасці і значэння Коласа. Масіўнасць — гэта не маштабнасць, а спрошчанасць — не прастата.

Пад раніцу прысніўся сон. Шырокі залiўны луг, вада і трава. І цераз луг, як можа дастаць вока, высокія дашчатыя масткі шырынёй на чатыры–пяць дошак, дошкі слізкія, гладкагабляваныя, масткі зігзагападобныя. Ідуць па іх Вера, Павел і я. Вера і Павел дурэюць, і мне страшна за іх, каб не зваліліся, але і не вельмі страшна, бо ведаю: нічога, апрача перапалоху, не будзе.

Недзе на канцы масткоў, здаецца, мы ўжо сышлі, убачыў Любу, яна ішла ў белым, у прадоўжную чырвоную лінію халаце. Я пазнаў гэты халат, ён некалі быў у яе, ці сукенка такая была. Халат напаўрасшпілены, відно загарэлае дзябёлае цела, і мной авалодала вострае мужчынскае жаданне. Гляджу на Паўла, хочацца, каб ён куды пайшоў, пагуляў, пакінуў нас адных...

І тут раптам паказаўся вярхом на цёмным кані Міша Дзегцяронак, сын каваля. Люба ўбачыла яго, зашпіліла халацік...

Прачнуўся ў шэсць гадзін, і нешта трывожна стала на душы. Ці добра ўсё ў дзяцей у Быцені, як там у Любы ў Югаславіі? Надта доўга цягнецца час... І зноў жа гэты цёмны конь. Ён заўсёды прынясціць хваробу.

Наверсе, у тэрапеўтычным аддзяленні, ляжыць Л. П. Александроўская. Узяў я букецік ружаў, зайшоў праведаць. Узрадавалася кветкам, як дзіця, увесь час нюхала іх, пакуль мы сядзелі на канапе ў калідоры. І таксама расказала пра каня. «Вось ужо гадоў з дзесяць сніцца адзін і той жа конь, не конь, а малады жарэбчык ярка жоўтай, як новая выгабляваная сасновая дошка, масці. І як толькі ён сасніцца, прыходзіць хвароба. Я яго чакаю са страхам, але чакаю... І цяпер, перад тым, як легчы ў бальніцу, ён зноў сасніўся. Здаецца, я ў звонкім сасновым бары, высокія звонкія сосны, лес праглядаецца наскрозь, і раптам бачу яго, а сама хаваюся, каб ён не бачыў мяне. Хаваюся за ствол сасны, ён бяжыць, а я ўкругаа сасны ўцякаю. Ён прабег, потым спыніўся і раптам гаворыць: «Не хавайся, усё роўна я бачу цябе». А потым сасніўся яшчэ раз. Ляціць раптам на мяне. Я думаю: усё, растопча, а ён цуп — стаў перада мной, ноздры раздзімаюцца, вочы гараць. Потым раз — стаў на заднія ногі, ды як дасць пярэднімі нагамі ў зямлю. Я гляджу, ажно перада мной магіла, і нікога кругом няма — ні жарэбчыка, нікога... І вось я чакаю яго, чыю гэта магілу ён пакажа, а ён усё не прыходзіць».

Ларыса Пампееўна засмяялася нярвовым астматычным смехам, але адчувалася, што гэты конь вельмі займае яе думкі. Я пачаў яе адгаворваць, сны — гэта трывогі дня, трывогі цела, усё пераносіцца на ноч, у сны, але яна некалькі разоў вярталася да гэтага жарэбчыка з нечакана жоўтай афарбоўкай. Голас яе ломкі, грубаваты, яна часта збіваецца з думкі, але потым вяртаецца.

Шмат гаварылі пра яе жыццё. «Хай бы вы напісалі ўспаміны... Вы столькі пажылі, столькі пабачылі...». «Ага, трэба...», — адказвае яна, але па голасе відно, што і сама не верыць, што зможа гэта зрабіць.

Я пазіраў на стары маршчыністы твар, слабое, расшатанае нервамі цела, стараўся ўявіць яе маладой, моцнай. Нешта ўгадвалася ў валявых, некалі, мусіць, вельмі прыгожых губах, жывых карых вачах, і ў голасе, не ў самім голасе, не ў яго інтанацыях, а ў паспешлівай гаворцы, асабліва калі яна пачынала ўспамінаць. Яна была там, яна жыла ў сваіх песнях, сваіх вобразах, з тымі людзьмі, з якімі сустракалася...

Дрыжачымі рукамі, спяшаючыся, яна перабірала пісьмы, кнігі, фотаздымкі ў шуфлядцы століка, пакуль не знайшла патрэбную запісную кніжку. Яна была на 2-м сусветным кангрэсе міру ў Варшаве ў 1951 годзе. Кітайцы падарылі ўсім членам кангрэса кніжачкі з партрэтам Мао. Ларыса Пампееўна папрасіла некаторых делегатаў пакінуць свае аўтографы. І яны пакінулі — Д. Шастаковіч, Ц. Хрэннікаў, Анна Сакс, М. Т. Задэ, К. Сіманаў і многія іншыя. Яна ўспаміналя пра іх, пра той час, і, можа, гэта было тое, што трымала яе на гэтым свеце. Хаця, не... З акна яе палаты добра відаць дахі хлявоў бліжэйшага двара. Ларыса Пампееўна расказала, як аднойчы вельмі доўга назірала за гульнёй маладых сівой поўсці ката і кошкі. Кошачка рабіла выгляд, што дрэмле, а кот стараўся нячутна падабрацца да яе. Вось ён асцярожна падымае лапку, асцярожна ставіць яе на бляху, пераносіць цяжар цела на яе, падымае другую лапку, і калі кошачка паказала, што яна ўсё чуе, ён адвярнуўся, быццам нічога такога і не памышляў...

Жоўты жарэбчык не доўга даў пажыць Ларысе Пампееўне. Яна памерла 23.5.1980 г.

Галоўны хірург рэспублікі, Аўдзеей, 48 гадоў. Апошнія дні ён быў у вельмі прыгнечаным стане. З'ездзіў да старых у Івянец. Як на развітанне. Сказаў: «Калі што, не памінайце ліхам». Пабываў на прыёме ў міністра, Мік. Саўчанкі. Гаворка была чыста службовая, пра сябе не сказаў ні слова. Сеў на машыну, трохі ад'ехаў ад Мінска, Цна-Ёдкава, стаў у кустах, недалёка ад дарогі, зачыніў усе дзверцы. Быў флакон з медыцынскім спіртам. Трохі выпіў. Павярнуў люстэрка, каб добра бачыць свой твар, дастаў ножык са страляючым лязом, прыклаў да артэрыі і выстраліў.

Знайшлі яго позна вечарам школьнікі. Сядзеў ён, аб'ехаўшы за рулём, кашуля ў крыві. Прычына: знайшоў у сябе рак печані. Як паказала ўскрыццё, дыгназ быў правільны.

За паўгода да гэтага прыязджаў блізкі сябра з Пецярбурга. У таго быў рак печані. Аўдзей паклаў яго ў Бараўляны, сам рабіў аперацыю. Той памёр у яго на руках.

Можа, і гэтая смерць зрабіла на яго сваё ўражанне. У жніўні дачка павінна была выходзіць замуж, а сын паступаць у інстытут...

Памерла Еўдакія Лось. 48 гадоў. Рак прамой кішкі. І нічога лішняга. Маладая, здаровая, актыўная, дзейсная. Чакала у самым развіцці, у самым квітнеючым таленце. Здаецца, усё ў табе і ўсё табе. Але жыццё робіць свае папраўкі. І ніхто не можа іх папраўляць.

Шмат хто зайздросціў ёй і, можа, думаў усякае. Але жыццё ўсё ставіць на сваё месца. І плюс, і мінус. Смерць так нечакана паставіла ўсё на сваё незразумелае і несправядлівае месца, што людзям засталося толькі рукі развесці.

Аперацыю рабілі ў Бараўлянах. Як казалі дактары, аперацыя прайшла добра. Хворая стала папраўляцца. Папрасіла, каб прынеслі залатыя завушніцы, начапіла іх. На дванаццаты дзень адчула сябе горш. Паклікала мужа, сына, былога мужа. Развіталася з усімі.

Яе перавялі ў рэанімацыйны пакой. Назаўтра яна памерла ад тромбафлебіта.

Як аказалася, ні залатых завушніц, ні грошай у яе партманэ не знайшлося.

БЫЛІЦА

ВІШНЁВЫЯ САДЖАНЦЫ

Мікола ЗГУБАРЭВІЧ

Хата ў старога Яўсея мураваная, прасторная, на цэлых пяць пакояў, акрамя шырокай, на ўсю падоўжную сцяну, веранды. Стаіць яна ў вабным месцы, у засені старых, яшчэ дзедаўскіх ліпаў.

Нябожчык Апанас, Яўсееў дзед, відаць, разлічваў на тое, што Мікульскіх у вёсцы будзе жыць яшчэ не адно пакаленне, таму пасадзіў вялікі сад, а вакол яго ліпы — гэтыя казачнага хараства дрэвы.

Яўсей, як будаваўся, таксама меркаваў па дзедаўскім разліку. Хацеў, каб было ўдосталь прытулку і дзецям, і ўнукам. Сусед яго Мацвей без злосці пакепліваў:

— Ты, Яўсей, далібог, палац надумаў адгрукаць! Не інакш кожнай дачцы і сыну па асобным пакоі. Глядзі, а то на старасць давядзецца з Хрысцінай шукаць адзін аднаго ў гэтакай гамэрні...

Яўсей хітравата пасміхаўся ў адказ і цешыўся роўнымі, з белай цэглы сценамі новай хаты.

З жонкай Хрысцінай яны працавалі на адной ферме яшчэ да таго, як пабраліся шлюбам. Яўсей даглядаў жывёлу, а Хрысціна даіла кароў. Дзяцей сваіх — трох дачок і сына — змалку прывучылі да сялянскай працы. Думалася — вырасціць дбайных памочнікаў. І дзеці, здавалася, палюбілі вясковае жыццё.

Але час мяняўся. Моладзь у пошуках заробку і лепшага жыцця рвалася ў горад. Пасля школы іх старэйшая дачка Шура падалася на навабудоўлю, а пасля звабіла і малодшых — Раю з Кацяй. Неўзабаве дзяўчаты адна за другой павыскоквалі замуж.

Хрысціна напачатку бедавала, што адна, як быліна, засталася на вёсцы. Блізкіх сваякоў у яе не было — браты і родныя, і стрыечныя пагінулі на вайне, а сястру пагналі ў Нямеччыну. Там недзе і прапала.

А праз нейкі час, калі дочкі разжыліся ў горадзе, настрой у Хрысціны змяніўся.

— Вось і добра, што паехалі адсюль! — не раз даводзіла Яўсею. — Я тут прапетавалася, гразюку па калена мясіла, дык хай хоць дзеці па-людску пажывуць. А то што яны тут пабачаць?! Ад хлева да хаты — і уся мая дарога. Спадніцы чыстай не было калі адзець! Хай яна спрахне, такая жытка!

Яўсей моўчкі слухаў, нібыта згаджаўся, а ў самога ў душу не раз закрадваліся сумненні: мо і праўду Мацвей калісь казаў? Каму я ўсё гэта дбаю? Калі ж Хрысціна моцна дакучала, ён, пыхкаючы цыгаркай, махаў рукой «адчапіся!» і выходзіў на падворак альбо ў сад.

Усе свае надзеі ён ускладаў на сына Івана. Хоць яго меркаваў прывязаць да зямлі.

Малым той вельмі цешыў бацьку. Змалку цягнуўся да сялянскай працы. У сем гадоў ужо спраўна запрагаў каня і, узяўшы ў рукі лейцы, упапад дарослым ўладна прыкрыкваў:

— Но-о, Сівы! Варушыся! Пляцешся ўсё адно, як нежывы!

— Ну Ганчык дае! — забаўляліся мужыкі на ферме. — Добрая змена бацьку расце!

Іван, калі вучыўся гаварыць, на пытанне «Як цябе завуць?», адказваў не Іван, а Ган. Так яго і празвалі ўсе — Ган, Ганчык.

А Ганчык тым часам рос, і не паспелі бацькі азірнуцца, як стаў Іванам — рослым, дужым хлопцам. На ферму да бацькі, дзе да таго часу шмат чаго змянілася, механізавалася, Іван не захацеў ісці, а пасля дзесяцігодкі падаўся ў вучылішча металістаў, пазней завочна паступіў у політэхнічны інстытут.

Яўсей, дапрацаваўшы да пенсіі, так і застаўся ў сваім мураваным асабняку ўдваіх са сваёй Хрысцінай. Сусед Мацвей як у ваду глядзеў...

Іван хутка ажаніўся і, не маючы пакуль сваёй кватэры, жыў на прыватнай. Праз некалькі гадоў яму падышла чарга на кааператыў.

У Яўсея з Хрысцінай, калі яны рабілі на ферме, заробкі былі неблагія. Грошай на сябе яны асабліва не трацілі, таму капейка ў іх вадзілася. Усе дзеці ведалі пра гэта і, станавіўшыся на кааператыўную кватэру, упэўнена спадзяваліся на ашчадныя кніжкі бацькоў.

Усім дочкам Яўсей з Хрысцінай добра памаглі, не пакрыўдзілі і сына. Калі прыйшлося ўносіць грошы на будаўніцтва, Яўсей амаль чатыры тысячы выклаў сыну на стол.

Яшчэ маладым Яўсей паўз усю мяжу ў сваім агародзе насадзіў вішняку. Вішань таму ў іх скрозь хапала ўволю. Былі гады, што цэлымі бочкамі здавалі на загатоўку. Цяпер, праўда, большасць дрэў знасілася, пастарэла. Неяк увесну Яўсей некаторыя зусім спілаваў, а замест спілаваных насадзіў вішнячку. Даглядаў маладняк, бы малых дзяцей. Яўсею хацелася хоць у дрэвах не даць выселіцца з гэтага селішча роду Мікульскіх.

Дочкі штогод прыязджалі гасціваць, цешылі бабу з дзедам унукамі. Іван жа наязджаў часцей за ўсіх. Балазе, жыў блізка. Памагаў бацьку і сена накасіць, і дроў нарыхтаваць. Яўсей у сына ў даўгу не заставаўся. На ўваходзіны падараваў сыну дарагі мэблевы гарнітур, пазней памог купіць каляровы тэлевізар. Абяцаў трохі падсобіць на машыну.

Але вось Іван перадумаў купляць легкавую і вырашыў будаваць лецішча. Яўсей, даведаўшыся пра гэта, ледзь не пасварыўся з сынам.

— Божа, на якую халеру табе тая будоўля! — абурыўся ён. — А мая хата чым табе не дача? Ліпы такія, сажалка побач, вішняк праз год-другі падымецца... Каму я ўсё гэта шаную? Табе ды дзецям тваім!

Старому здалося, што гэта не Іван, не ягоны сын, а нейкі чужы, незнаёмы чалавек, адсякае карэнні не вішанькі, а ўсяго іх Мікульскага, старэйшага на вёсцы, роду

Але Іван упарціўся, стаяў на сваім, прызнаўся, што заказаў ужо матэрыялы і наняў будаўнікоў.

Калі сын паехаў, Яўсей усю злосць спагнаў на Хрысціне:

— Тваё выхаванне! Хіба не бачыш, што твае дзеці панамі робяцца? Асабняк яму захацелася... Пра нас хай бы падумаў... На старасці вады не будзе каму падаць...

Хрысціна маўчала. Бачыла, што стары мае рацыю, але дзе там ёй Івана пераканаць? Вядома, не трэба быў яму той летні дамок. У дачок зяці былі спрытныя, рукастыя. Даўно ўжо сабе пабудавалі. Яна адчувала, што сына падбухтырыла на будаўніцтва нявестка. «У іншых ёсцека, хай і ў нас будзе!» — такі грэх за ёй водзіцца.

У водпуск Лена звычайна ездзіла куды-небудзь на поўдзень. Дзяцей жа, Ігарка з Юркам, прывозілі да дзеда з бабай. Сваіх бацькоў у Лены не было. Рана зусім памерлі. Калі нявестка прыязджала з Іванам на выхадныя, Яўсей з Хрысцінай працай яе асабліва не нагружалі. Але ж як у вёсцы без працы абыдзешся? Улетку ёй даводзілася памагаць сена сушыць, грады прапалоць... Затое пойдзеш у агарод, дык чаго там толькі няма: садавіны ўсякай, гародніны. А што тая дача? Калі там што вырасце? Дадуць нейкі шматок зямлі, пяску з глінай...

Захапіўшыся пабудовай дачы, Іван усё лета да бацькоў прыязджаў рэдка. Нават радоўку Яўсей з Хрысцінай адпасвалі самі. Пасля дзеці пайшлі ў школу, і часу вольнага зусім паменела. Аж у пачатку кастрычніка Іван прыкаціў дамоў з нейкім сваім знаёмым на «Жыгулях». Яўсея якраз у той дзень зранку не было дома. Яшчэ на досвітку пайшоў у лясніцтва прасіць дроў. Абяцаў неўзабаве вярнуцца. Ён нібыта прадчуваў, што сын павінен прыехаць, але чамусьці недзе забавіўся.

— А дзе ж бацька, мама? — павітаўшыся, запытаў Іван.

— У лясніцтва яшчэ на золку пайшоў. Мо там дроў гатовых дадуць, то надумаў прывезці. Сядайце, сядайце, хлопцы! — замітусілася старая. — Я зараз на стол чаго збяру. Пакуль суд ды справа, то і бацька адшукаецца.

— Мам, мы вось з суседам па дачы вырашылі садок пасадзіць, дык я ўспомніў пра бацькавыя вішнёвыя саджанцы. Іх жа шмат у нас...

— Э не, сынок! Ты пра гэта з бацькам гавары. Ён іх садзіў, яму імі і распараджацца.

— Разумееш, мама, Алёша спяшаецца, таму нам няма часу чакаць бацькі. Я ўпэўнены, што ён не запярэчыць. Мы ж не ўсе выкапаем, а толькі некалькі дрэўцаў.

— Глядзі, Іван, каб не зазлаваў стары. Вельмі ж ён шануе гэты вішняк, цешыцца, як малы. — Хрысціна паківала галавой, уздыхнула і пайшла ў веранду.

Іван са сваім сябрам выйшлі на двор, узялі рыдлёўку і маленькую сякерку і накіраваліся ў сад.

Дома вялікай работы не было, таму Яўсей дахаты асабліва не спяшаўся. Па дарозе стрэў Саўку Мініна, сябра дзяцінства, і яны, слова за словам, ладны час прагаварылі. Толькі нейкае прадчуванне цягнула Яўсея дахаты.

Убачыўшы ля брамы сінія «Жыгулі», абрадаваўся: «Нехта з дзяцей, відаць, прыехаў. Мо Шура з мужам? У яго сіняя машына...»

Яўсей зайшоў на веранду, прачыніў дзверыну ў хату: там было ціха. Выйшаў на двор.

З глыбіні саду даносіліся галасы. Сынаў голас Яўсей ураз пазнаў, іншы быў незнаёмы. «Мусіць, Іван апошнія антоны збірае», — падумаў Яўсей. Але раптам пачуў чахканне рыдлёўкі.

Яўсей таўхнуў рукой брамку ў сад і паўз пуню наважыўся падысці да хлопцаў. І раптам сэрца яго ёкнула. Ля плоту стаялі выкапаныя саджанцы вішняку. Іван са сваім сябрам захапіліся справай, і Яўсея не заўважылі. Сын у гэты момант наводмаш падсякаў сякеркаю разлапістыя карэньчыкі маладзенькай, самай прыгожай Яўсеевай вішанькі.

«Што ты робіш?! Загубіш дрэва!» — хацелася крыкнуць Яўсею, аднак ён не здолеў. Як мову адняло. Старому здалося, што гэта не Іван, не ягоны сын, а нейкі чужы, незнаёмы чалавек, адсякае карэнні не вішанькі, а ўсяго іх Мікульскага, старэйшага на вёсцы, роду.

«Божа, чаго я не дагледзеў у сваім сыне? Чаму не навучыў? — вярэдзілі душу старога Яўсея цяжкія пытанні. — Хай жа б хоць раней сказаў... Я б сам асцярожна, з зямелькаю выкапаў бы тыя саджанцы...»

Роспач і злосць поўнілі Яўсееву душу. Да сына ён так і не падышоў. Стуліўшыся пад паветкаю, бачыў, як Іван з сябрам ладкавалі паклажу ў машыну. Глядзеў, як з багажніка сіратліва тырчэлі похапкам адкапаныя карэньчыкі вішнёвых саджанцаў, і вочы яго спакваля вільгатнелі.

Калі машына, злосна фыркнуўшы, рванулася з месца, па маршчыністых шчоках старога, як гарошыны, скаціліся дзве слязінкі...

Першага ўраджаю ад свайго маладняку стары Яўсей так і не дачакаўся. Менш як праз год нечакана захварэў, злёг і з бальніцы дамоў ужо не вярнуўся...

Хрысціну забрала да сябе малодшая дачка, а хата з вялікім садам так і засталася без гаспадароў. Вёска была далёка ад горада, і ніхто тут не хацеў сяліцца. Аднак улетку, як зацвіталі ліпы, сад гудзеў ад пчол, якія аднекуль сюды прыляталі. А ўздоўж мяжы вабілі позірк налітыя чырванню вішні.

ФРАГМЕНТ РАМАНА

У ПАДЗЯМЕЛЛЯХ ГЕВАНТА

Тадэвуш МІЦІНЬСКІ

Надзвычай неардынарны польскі пісьменнік Тадэвуш Міціньскі нарадзіўся ў 1873 годзе ў Лодзі, а загінуў пры таямнічых абставінах у 1918-м у Беларусі, пад Чэрыкавам. Загадкавы раман «Нятота. Таемная кніга Татраў», прасякнуты ідэямі месіянізму і містыцызму, лічыцца адным з галоўных яго твораў. Фрагмент гэтага рамана і прапануецца чытачам «Літаратурнай Беларусі».

Выйшаў Маг Літвар на зорнае святло.

І зноў ён у пустэчы, высечанай сценамі чорных гігантаў. Цішыня настолькі велічная, што чуецца пад валунамі шолах росных струменьчыкаў.

У змроку, сярод блакітных тумаnoў, рушыла жанчына, нібы прывід.

Вечная сярод тых, хто жыве.

У яе руках была трохкутная арфа, струны якой прадвяшчалі Новае Адкрыццё. Над тварам, бялейшым за месяц, узносіўся гушчар цудоўных валасоў.

І распавядала тая песня пра гады чакання сярод слёзаў і пакут. Звярталася да сваіх патаемных думак, народжаных слотнымі, лістападнымі, безнадзейнымі начамі. Да думак, што паўставалі ў ночы месяцовыя, зеленаватыя, магічныя, сярод бароў над берагам паўночнага мора. Песня пыталася, калі пераможа Каханне?

Злавесны боль прымружыў вочы Мага Літвара.

У яе слязах парушаліся скляпенні нябёсаў.

Маг Літвар, нерухомы вартавы, стаў ля брамы смерці і вымавіў у вечнасць: ніколі! Заўважыў, што ўстрапянуліся кончыкі яе далікатных, з пералівамі розных адценняў, пальцаў. Зірнуў, але не ў вочы яе, падобныя да гротаў, дзе фафарычна ззяе аметыстамі і чорным агатам азёрная глыбіня Марскога Вока, — зірнуў у страшэнны змрок пекла, якое пакрывала яе вязніцай.

У змроку тым блішчэла некалькі цьмяных зорак — гэта быў Змеяносец. Паказаў ёй: нібы яе ўзводзіў на алтар і прыносіў у ахвяру богу Пекла. Прамовіў словы моцныя, недасяжныя.

Яна адышла.

Чуў яе ціхія крокі, нібы хтосьці пад зямлёй забіваў цвікамі труну, — цішэй — нібы сыпалася зямля на твар памерлай — так незваротна, як дакрананні кінутых у магілу кветак.

Змоўкла пустэча вялікіх гор.

Змрочны Гевант пужаў — прадвеснік смерці, суправаджальнік да краю ценяў, ён іскрыўся ад зор. Маг прылёг у лагчыне гары.

Невядома, колькі нерухомых эпох — глядзеў уверх, дзе плыў на нябачнай барцы таямнічы, жахлівы месяц. Падножжа гары, што нагадвала магілу рыцара, распасціралася на некалькі даліная і мела такую велізарную вышыню, што манументальны крыж на рыцарскім шлеме здаваўся цацкай. Галава, патрэсканая ямінамі і прадоннем, не змяшчала ўжо выявы твару.

Боль і таямнічасць згушчаліся ў нейкі звышчалавечы выгляд вусцішна скамянелай Бясконцасці. Памерлі мільёны ляхаў, змяніўся шэраг каралеўскіх дынастый, перш чым тыя шматпавярховыя валуны з шэрага граніту былі абцятыя даждамі ды снягамі і зведалі на сабе ўздзеянне лавінаў, перш чым гіганцкая рака высекла вадападам каменную масу ў бажніцы Геванта.

Маг Літвар адчуў унутры ўсхваляванае пачуццё тоеснасці з тым, чый прах ужо даўно быў развеяны з па-блюзнерску парушанага кургана. Але прасякнуты болем вечнай Ілюзіі, вымавіў у найглыбейшым маўчанні сваім: не кружляе нічога над пустэчай знішчэння!.

Каменны гмах раптоўна пахіліўся на бок, цела Мага, што перад тым ляжала бяспечна, зараз завісла над безданню, дзе лесам коп'яў тырчэлі яліны.

Ён трымаўся за скальны выступ, а Гевант сваёй магутнай вагой схіляўся ўбок насуперак усім законам гравітацыі...

Мабыць, Гевант хацеў спалохаць такім чынам Мага, як мамант малую казурку, што зачапілася за агромністы карак; лінію гарызантальную ён зносіў перпендыкулярна і спадаў, але найбольш здзіўляла тое, што рухі адбываліся ў вакууме, то бок удараў аб зямлю не было чуваць! Раптам, быццам карабель падчас буры, які сядае на водмель, Гевант цяжка абваліўся, а скалы страпянуліся, як подых бушуючага мора. Кожны смяротны страціў бы прытомнасць ад знясілення і жудасці і зрынуўся б з тых паверхаў, вышэйшых за муры Вавілонскай вежы.

Зянаццу блiснула святло, запаленае ў аддаленым кутку — можа, месяц кінуў з-за хмары свой заходзячы прамень? Не, хутчэй гэта быў бляск унутры Геванта.

Маўчанне. Нечаканы спакой. Маг рушыў па біўнях вапнавага дна Прамора Татраў. З галавы ідала святло здавалася зусім далёкім і ўрэшце згасла.

Калі Маг Літвар урэшце агледзеўся перад уваходам, прыхаваным у трохкутніку забрала Геванта, з вуснаў яго сцякала крывяністая юшка.

Душа сплывала разам з ёй — зведае гора?

Ён зноў увайшоў у шчыльны калідор, які выгінаўся чарвяком, і намацаў апошнюю мяжу; гэта быў мур або шліфаваная скала? Ніводны геній не здолеў яе адчыніць. Але нягледзячы на гэта, ягоныя рукі дакраналіся да рунаў, і пры адным толькі націсканні скала прыадчыніла яму ўваход у нейкую галерэю над прорвай, адкуль дзьмула ледзяным холадам. Шолахі і ўздыхі — напэўна, прыляў павелра праз шчыліны, — хоць здавалася, што гэта дзейнічаюць здані.

Скала самкнулася. Памацаўшы валуны, якія выступалі над прорвай, Маг адчуў, што яго сэрца замірае, бо не мог знайсці выйсця назад — значыць, патрапіў у магільную пастку. Выцягнуўшы руку, ён ухапіўся за канец ланцуга і без даследвання таго, куды гэта прывядзе, пачаў караскацца па ім угору — як на званіцу. І не ўступіў, а на каленях патрапіў на парог малой залі, акружанай калонамі з выгравіраванымі законамі ўсёй зямлі. Праз вузкую адтуліну ў гары, што прарэзвала велізарнае верхняе плато, было відаць, нібы ў тэлескоп, рухавую Туманнасць Арла, якая адлюстроўвалася ад увагнутых люстэркаў ледавіка і кідала чароўнае ззянне на каштоўныя камяні — аздабленні сцен.

Зіхацелі мільёны агеньчыкаў барвовага задыяка — смарагды багіні Маруны стваралі ціхі бляск найглыбейшай мудрасці; астральныя крылы Кастара і Полукса на архітраве патаналі ў змрочных глыбінях халоднага Марскога Вока.

Моц і натхненне перапаўнялі Мага, адраджалі і ўзвышалі да вечнага экстазу маладога Светавіта. Адчуў сябе ўладаром, прасякаў мільёны гадоў, узнімаўся на вяршыні неймаверных гор.

Потым азірнуўся.

Ён быў не адзін. Адчуваў гэта, не заўважаючы нікога. І вось пабачыў на сцяне водблiск рукі, якая свяцілася, высунутая з-за чорнай хмары. Не ведаў, што яна мусіць падсвечваць, толькі пачуў, як раптам аднекуль выпаў меч і пачаў вастрыцца аб глебу. Гэты меч мільгануў у паветры і апынуўся ў далоні прывіда, які, паскрыпваючы вострым лязом па граніце, выпісаў на страчанай арыйскай мове:

— Я існую.

Зырчэнне Туманнасці ў крышталёвых люстрах было такім моцным, што Маг выразна чытаў тое слова — вечнае, творчае, нязведанае, нібы першая прыступка да цудоўных святыняў, ужо невядомых на зямлі. Рука прывіда адным тым выразам акрэсліла дзівосную паэму спрадвечных удасканальванняў Памерлага...

Гара Гевант

Пераклад з польскай Ірыны Хадарэнка

ВЕРШЫ

МАЛЬБА ЖУРБЫ

Ніна ДЗЯБОЛЬСКАЯ

У музеі

Бляск ад мяча, клінка і шпагі
не абвастрае страх.
Ах, колькі ж сілы і адвагі
не выспела ў руках.
А кроў цурчэла і пяклася,
шыпеў чужы пясок.
На скроні, як на сумнай пласе,
уздрыгваў валасок.
Замардаваных — без аховы
кладуць да царскіх ног…
Зіхціць з вітрыны двухбаковы
клінка жывы спалох.

***

Ці ж слова было напачатку?
Было? То з гаворкі якой?
Хто выпек яго як аладку?
Мо выдыхнулі талакой?
Ці ж слова было напачатку?
А можа жалейка вяла
гул росных лугоў на брусчатку,
дзе гук зачала кавяла?
Не слова было напачатку.
На воклік зазыўнай трубы,
каб рэха завабіць у хатку, —
мальба вырастала з журбы.

Каля ледніковай грады

Лілейна возера мігцела:
быў лес — як абдымач.
Свавола-чайчка ляцела.
На кліч-скрыпач
успырхнулі лебедзяняты.
Настырныя бабры
пляціну ладзілі і ў сваты.
А смоўж свае грыбы
надкусваў вельмі акуратна.
Сук не дзяўбаў, застыў парадна
з пярэстай галавою дзяцел.
Хто нам такі пакінуў рай?
Ляднік з грады раскрыліў край,
каб радаваліся дзеці, дзядзі?



Фота Віктара Хурсіка

Ніна Сяргееўна Дзябольская (справа) і Сяргей Панізьнік

З вагоннага акна

Зрэдчас ускочыць царква
на залаты касагор.
Чэзне ля трасы трава,
Цьмее задумлівы бор.
Шэры каршун знедужэў.
Гнёзды без птушанят.
Родненькі далягляд,
хто нам цябе зберажэ?

Пасля майдану

Дзе мы былі? — У закуце дастатку.
На што нацэльваліся? — Толькі
на машну.
Час марнавалі? — Ах, вы ўжо прабачце
статку
і верхаводнаму ражну.
А злая сіла прэцца… Існы Божа!
Дурыла хараводзіць з галышом…
Сабраць бяссілле мы ў кулак не можам
і толькі гарлапанім пад крыжом.

Пераклад з расійскай Сяргея Панізьніка

АРХІЎ

ВАСІЛЬ БЫКАЎ. ЛІСТЫ З ГОРАДНІ

Нілу Гілевічу

[9 кастрычніка 1963 г.]

Ніл, дарагі чалавеча!

Дзякуй табе за твае добрыя словы і за спачуванне. Толькі на фільм [«Третья ракета» («Беларусьфільм», 1963; аўтар сцэнарыя В. Быкаў, рэжысёр Р. Віктараў). — *С.Ш.*] гэты я ўжо даўно плюнуў, як кажуць. Не па-мойму ён зроблен, шмат што не так, дрэнна, слаба — чорт з ім, з фільмам. Гэта балаган, а не мастацтва — кіно. У літаратуры, нягледзячы на ўсё, усё больш тваіго, аўтарскага, а кіно — дрэнь.

Сёння атрымаў ліст ад Юркі Вылчава [Вылчаў Георгі Дзімітраў (нар. у 1926) — балгарскі крытык, літаратуразнавец, перакладчык]. Ён між іншым просіць прыслаць яму выклік чытаць лекцыі на 1 м[еся]ц ад Мінскага або Гродзенскага ўніверсітэтаў, як ён піша. Я зусім не ўяўляю, як гэта зрабіць і ці магчыма гэта.

Краўчанка, фотакор наш, яшчэ не знайшоў таго фота, што ты прасіў. Калі знойдзе, я табе прышлю.

Вось, бадай і ўсё.

Бывай здароў і добрых вершаў табе.

З шанаваннем — Васіль.

Прывітанне Івану Н[аумен]ку.

Янку Брылю

Дарагі Іван Антонавіч!

Прыехаўшы з Каўказа, знайшоў Ваша пісьмо, якое мяне, вядома, дужа парадавала. Па-першае, таму, што гэта першы пісьмовы водгук, ну а, па-другое, таму, што ён ад чалавека і пісьменніка, які для мяне здаўна вельмі і вельмі шмат значыць. Так што — дзякуй вялікае і шчырае.

Сапраўды, мы вельмі чэрствыя адзін да аднаго, нават аднадумцы, у большасці падвержаны сальераўскаму пароку, і не кожны здольны пераступіць цераз сябе, каб парадавацца чужой удачы. У гэтым сэнсе «Мост» для мяне — радасць, у тым ліку і мастацкая (як для чытача), але найбольш за аўтара, які, даволі пакрыўджаны, вяртаецца на «кругі свая», да сваёй, чалавечай, хоць і абскубанай, але праўды. Вось гэты аўтарскі кірунак і змусіў мяне падтрымаць аповесць, я сам напісаў рэцэнзію, і «ЛіМ», трохі яе папатрашыўшы, надрукаваў [Размова пра рэцэнзію на аповесць І. Шамякіна «Мост»: Быкаў В. Улада праўды // Літаратура і мастацтва. 1965. 27 жн.].

А з «Раман-газетай» я Вам спачуваю. Гэты Ільінкоў такі асцярожны тып, ён так доўга прынюхваецца, што ўрэшце атручвае ўсю радасць ад выдання 1 млн. тыражом. Больш палахлівых і больш асцярожных радактараў, чым у «Раман-газеце», я не сустракаў нідзе.

Ну, а мы тут жывем ціха і мірна. Аляксей [Карпюк Аляксей Нічыпаравіч (1920—1992) — беларускі пісьменнік; сакратар Гродзенскага абласнога аддзялення СП БССР (1965—1970, 1978—1992)], вызвалены ад свае чыноўнічай службы, цяпер «обуреваем» тысячай ідэй самых розных, носіцца з імі па начальству, піша ў высокія інстанцыі. З Мінска выпісаў урэшце Броўку і брыгаду пісьменнікаў і цяпер бударажыць увесь горад сустрэчамі, вечарамі…

Ну дык яшчэ раз Вам вялікае дзякуй.

Бывайце здаровы, усяго Вам найлепшага.

Да сустрэчы!

Ваш — Васіль.

15/IX–65 г.

Аляксей Сіманаў, Валянцін Аскоцкі, Лазар Лазараў і Васіль Быкаў

Максіму Танку

Першаму сакратару праўлення Саюза пісьменнікаў БССР

Паважаны Яўген Іванавіч!

На днях выдавецтва «Беларусь» без колькі-небудзь пераканаўчага абгрунтавання афіцыйна адмовіла мне ў выданні аповесці «Праклятая вышыня», раней запланавага на 1969 год.

На працягу апошніх трох год гэта другая адмова запар. Такім чынам, фактычна я пастаўлены перад немагчымасцю выдавацца ў Беларусі на беларускай мове.

Я прашу Вас, сакратарыят, прэзідыум і секцыю прозы СП БССР выкарыстаць высокі аўтарытэт свае арганізацыі і аказаць мне магчымае садзеянне ў гэтым канфлікце з выдавецтвам «Беларусь»

З павагай Васіль Быкаў.

26 ліпеня 1968 года.

Валянціну Аскоцкаму

17/VII–69 г.

Валя, дорогой дружище!

Спасибо тебе за теплые слова поддержки, они, разумеется, дороги мне. Но я не очень отчаиваюсь — уже привык за последние годы и другого не ждал. Правда, я все же не думал, что наш «ЛіМ» тут же схватится за это дерьмо из-под Мотышова и перепечатает его на своих страницах [размова пра артыкул І. Мацяшова аб аповесці «Круглянскі мост»], как он это незамедлительно сделал, видимо, не найдя подходящего подонка в Минске. Ну и то бог с ним. Я всем прощаю.

Эти дни усиленно читал, в т. ч. и Б. Окуджавский роман [Акуджава Булат Шалвавіч (1924–1997) — расійскі паэт, празаік, бард. Размова, відаць, пра раман Б. Акуджавы «Бедный Авросимов» (Дружба народов. 1969. № 4–6).]. Неплохо сделанная вещь, стилистическая сторона просто изумляет. Правда, слишком все зашифровано, затуманено, плохо просматривается в сторону замысла. Но хороша вообще. Превосходен Камю («Падение» в № 5 «Нового мира») и один рассказ Искандера (там же), этот последний бесподобен. Прочитал и твою статью в последней «Литературке» [Оскоцкий В. Безбрежная романтика и берега романтизма // Литературная газета. 1969. 16 июля] — молодцом, правильно воюешь с этими псевдоромантиками и их апологетами. Но романтика сейчас нужна, она дает простор для идеализации действительности. К чему это приводит, мы уже знаем.

В Москве давно уже не был — нету дороги. Книжка в «М[олодой] Г[вардии]» засохла на корню — не издают. В остальном живу помаленьку. Алексей К[арпюк] собирается в Польшу. Я немножко поезжу в конце июля и буду сидеть дома.

Как ты? Куда и когда в отпуск? Как ребята и где Вася? Мой самый сердечный поклон Нине [Ніна Васільеўна Мінаева — жонка В. Аскоцкага].

Как с приемом-выступлением?

На этом обнимаю

твой Василь Б.

Грыгорыю Бакланаву

19 октября 69 г.

Дорогой Григорий!

Спасибо тебе огромное за дружеское слово поддержки, сказанное как нельзя вовремя. Только это и утешает, других утешений в нашей жизни осталось уже немного. Не скажу, что все эти крупнокалиберные залпы совсем уж подавили меня, но иногда вызывали недоуменный вопрос: отчего уж так уничтожающе — за что? Неужто так стала опасна правда на уровне дворника, даже не домоуправа? А здесь все это еще усугубляется провинцией и провинциализмом обывателей всех рангов. Но — потерпим. Терпели не такое.

В следующем месяце планирую быть в Москве, хотелось бы повидаться. А пока обнимаю тебя по-братски и с благодарностью.

Твой Василь.

Мой сердечный привет Элле и малышам, а также всем Лазаревым.

В. Б.

Валянціну Аскоцкаму

Дорогой Валентин, здравствуй!

Получил твое, как всегда, желанное для меня письмо, спасибо. Поздравляю тебя, хотя и с опозданием, с приемом-вступлением [Размова, відаць, пра ўступленне В. Аскоцкага ў СП СССР.], теперь этот год для тебя и еще для одного, неудачного, литератора будет памятен: тебе своим +, а ему -. Но что ж, каждому свое — как было написано над входом в Бухенвальд.

А мы вот только с пленума. Думал, ты тоже появишься в Минске, но из москвичей было лишь трое: З. Богданова (которая не может мне простить Бритвина [Брытвін — адмоўны персанаж аповесці «Круглянскі мост».], так сказала), ее заступница из «ЛГ» и Щедрина. Был юбилейный доклад Мележа, юбилейные прения, подпорченные, как всегда, выступлением А. Карпюка. На том все и кончилось.

Дорогой Вл.! «Родственников» [раман расійскага пісьменніка Юрыя Васільевіча Бондарава (нар. у 1924).] я читал, правда, они не показались мне неудачными, показались лишь опоздавшими на 5–6 лет. А вот «Горячий снег» [Раман Ю. Бондарава.] меня поставил в тупик. Я не знаю, что это такое? И зачем? Кочетова [Кочатаў Усевалад Анісімавіч (1912—1973) — расійскі пісьменнік; з 1954 г. сябра праўлення СП СССР; з 1961 г. галоўны рэдактар часопіса «Октябрь».] я не читал, наслышан уже и без того об этой вещи [Размова, відаць, пра раман «Чего же ты хочешь?», у якім В. Кочатаў выступіў супраць разбурэння савецкага грамадства заходняй псеўдакультурай і прапагандай. У 1969 г. 20 прадстаўнікоў інтэлігенцыі падпісалі ліст супраць публікацыі рамана.]. Слышал, как В. Страфа собирается ему не подать руки…

За твоей уважаемой «ДН» [Часопіс «Дружба народов».] я, разумеется, слежу пристально, хотя и не все читаю. Теперь вот ожидаю окончания П. Куусберга [Куусберг Пауль Аўгуставіч (1916—2001) — эстонскі пісьменнік; народны пісьменнік Эстонскай ССР (1972).], прочту непременно. Но что я могу предложить или пообещать вам? Ты же знаешь мое положение — не могу же я отказать тем, кто для меня столько сделал. А пишу я мало, впредь же намерен еще меньше. Как можно меньше! Потому что уже нет на теле живого места — все избито. Впрочем не только у меня плохо. Наше издательство окончательно вернуло книжки В. Короткевича, В. Адамчика, М. Стрельцова, А. Карпюка. Я даже и не обращался туда.

Так что когда-нибудь в будущем. Если придется.

Твоя книга [Размова, магчыма, пра кнігу — Оскоцкий В. Единство пути, многообразие поиска: (о национальном и интернациональном в советской литературе). М.: Знамя, 1969.] передо мной, я ее посмотрел, собираюсь внимательно прочесть. Материал, как видно, огромный, дай бог тебе умно распорядиться им. Да ты умеешь. Валя, ты же умница. Пусть тебе будет хорошо в этом мире.

Может, как-нибудь свидимся.

А пока — обнимаю.

Твой В. Б.

Мой поклон Нине.

23 ноября 69 г.

Мікалаю Пашкевічу

Паважаны Мікола Пашкевіч [Пашкевіч Мікалай Арсеньевіч (1936—1972) — беларускі педагог, літаратуразнавец, краязнавец]!

Я шчыра дзякую за добрыя словы прысвячэння і за ўвагу, выказаную прысланнем кніжкі. Вы так многа паставілі перада мной пытанняў, што, відаць, адказаць на іх давядзецца ўсё ж вусна. Як-небудзь бліжэй да лета я пастараюся прыехаць да вас, тады пагаворым аб усім падрабязна.

Аб тым я паведамлю дадаткова.

А пакуль што шлю Вам асабіста і ўсім гурткоўцам самыя найлепшыя пажаданні.

Бывайце здаровы.

Са шчырасцю В. Быкаў.

12/II–70 г.

Мікалаю Пашкевічу

Шаноўны Мікалай Пашкевіч!

Нам з Вамі яўна не пашэнціла ў гэтую вясну — так навалілася на мяне клопату ды і хвароба, што, як бачыце, у маі-чэрвені паездка не адбылася. Запіску Вашу знайшоў 28[-га] па прыездзе з Масквы, дзе даўгавата прабыў, а цяпер, вядома, няма сэнсу рушыць. Значыцца адкладзем на восень — верасень-кастрычнік, авось тады лепш пашанцуе.

Я гэтым самым прашу ў Вас і Вашых вучняў прабачэння, але ж не наўмысна падвёў Вас. Акалічнасці, нярэдка здараецца, усё яшчэ мацнейшыя за нас.

Усяго Вам найлепшага ўлетку, з вінаватасцю В. Быкаў.

30/VI–70 г.

Мікалаю Пашкевічу

Дарагі Мікола, я, безумоўна, павінен павініцца перад Вамі, але і цяпер я не ведаю, што і як мне рабіць з Вашаю просьбай. Нейкі час я адсутнічаў у Гродні, ездзіў на Полаччыну, прыехаў не зусім здаровы, хаджу ў паліклініку, шмат розных літаратурных (і не толькі) спраў і тут — няздзейсненае абяцанне. Вядома, я не супраць і з задавальненнем бы, але не ведаю і цяпер калі зробім гэта.

Але зробім!

Абавязкова прыеду ці адгэтуль, ці з Мінску, за які дзень да таго дам тэлеграму.

На тым і дамовімся.

Тады пагаворым пра ўсё.

А пакуль —

з прабачэннем Ваш В. Быкаў.

4.X.70 г.

Міхасю Лынькову

[Снежань 1970 г.]

Дарагі Міхась Ціханавіч!

Будзьце здаровыя і шчаслівыя ў Новым, 1971 годзе.

Усё жыццё збіраюся сказаць Вам, як я люблю Вас ад самага дзяцінства.

«Гой» была мая першая прачытаная ў жыцці кніжка, я тады быў зусім малы, а Вы — такі малады.

Са шчырасцю абнімаю Вас.

Ваш Васіль Быкаў.

Падрыхтоўка да друку і каментары Сяргея Шапрана.

Яшчэ больш лістоў — у новых нумарах «Дзеяслова»

КРАЙ

ЛУНІНЕЦ І ЯГОНЫЯ ВАКОЛІЦЫ,

АЛЬБО ВАНДРОЎКА ДЛЯ ПАЭТАЎ І ЧЫТАЧОЎ

Аксана СПРЫНЧАН

Адразу папярэджу: назва палескага мястэчка Лунінец — амбівалентная. Тыя, хто любіць яго, лунаюць у нябёсах натхнення. Абыякавыя ж патрапляюць у луну — яму ў балоце. Вядома ж, гэта пашыраецца і на іншыя вёсачкі і мястэчкі Лунінеччыны, звязаныя прамянямі сцяжынак, дарог і чыгуначных шляхоў. Пра найбольш яскравых сонечных зайчыкаў-палешукоў я і хачу апавесці тым, хто любіць чытаць і вандраваць.

Фота аўтара

Свята-Юраўская царква ў Сінкевічах

Белае і чорнае

Свет падзяляецца на гэты і той, а гэты свет бывае не толькі белым, але і чорным. Каля вёскі Бастынь ёсць Белае і Чорнае возера, і нават герб вёскі падзелены напалам белым і чорным колерамі. Калі да Чорнага возера дапяць цяжка, дык Белае шырока расплюшчыла сваё чароўнае вока. Возера Белае — надзвычай гарманічнае, гэтым яго можна параўнаць са Свіцязззю. А яшчэ тым, што ў гэтых азёрах Беларусі расце надзвычай рэдкая рэліктавая расліна — лабелія Дортмана. Стылізаваная лілея на гербе Лунінца — гэта і ёсць сціплая кветачка Белага возера. Ейная краса і чысціня ўпрыгожвае гербы і вёсак Лунінецкага раёна: то мышалоў трымае яе ў кіпцюрах (вёска Лунін), то чапля ў дзюбе (вёска Сінкевічы), то яна проста ў верхнім блакітным полі герба Мікашэвічаў…

«Адам Міцкевіч на Відзіуш-гары»

Лабеліяй Дортмана Адам Міцкевіч дакладна любаваўся на возеры Свіцязь. Ці быў ён на возеры Белым, звестак няма. А вось паданне пра тое, што знакаміты паэт прыязджаў у Кажан-Гарадок на магілу Авідзія, існуе. Якіх толькі метамарфозаў не бывае ў жыцці, каханні і смерці, таму цалкам імаверна, што паэт, які нарадзіўся ў Італіі, выпраўлены ў выгнанне на Чорнае мора, урэшце сканаў у Кажан-Гарадку. І на месцы ягонай магілы насыпаны капец — Відзіш (Відзіуш, Авідзіуш)-Гара. Таму адно застаецца чакаць карціну «Адам Міцкевіч на Відзіуш-Гары».

На грані(це) фантастыкі

Каб пабачыць фантастычную карціну, трэба трапіць на тэрыторыю гранітнага кар'еру ў Мікашэвічах. Найбуйнейшае ў Еўропе прадпрыемства па вытворчасці друзу ўражвае не толькі сваім маштабам (кар'ер у Мікашэвічах — найбольшы ў Еўропе), але і інфраструктурай: вадаспады, саракапяцітонныя БЕЛАЗы падобныя да дзіцячых машынак, дзясяткі кіламетраў серпанцінавых дарог, нараджэнне аблокаў падчас выбуху граніту…

На безкаменнай зямлі Лунінеччыны менавіта на дзесяці глыгах граніту каля царквы Перамянення ў вёсцы Язвінкі напісаныя Боскія запаветы.

Сысці немагчыма застацца

Ёсць на Лунінеччыне месца, з якога, як той казаў, сысці немагчыма, хоць і трэба, калі ты яшчэ здольны хадзіць. Гэта клады ў вёсцы Багданаўка, якія захавалі для нас часы паганства. На магілах дзясяткі дубовых прыкладаў: дарослым — вялікія, дзеткам — маленькія, мужчынам — з сукамі. Можна сустрэць і, так бы мовіць, пераходны варыянт ад паганства да хрысціянства: дубовы прыклад з суком-крыжам. Рэштк і такіх магіл ёсць і на іншых могілках Лунінеччыны, але менавіта ў Багданаўцы дубовыя брамы паміж светам жывых і памерлых захаваліся найлепей.

Лунінецкі вузел

Я не ўмею завязваць марскія вузлы і не ўмею разблытваць іх. Я люблю чыгуначны вузел, бо нарадзілася ў Лунінцы. Такі вузел і не завяжаш, і не разблытаеш, у такі вузел прыязджаеш і з такога вузла з'язджаеш. Ёсць месцічы і хутаране. Ёсць вяскоўцы і местачкоўцы. І, пэўна ж, ёсць вузялкоўцы. Прынамсі, я — вузялкоўка, улюбёная ў цягнікі, дызелі, электрычкі, рэйкі, шпалы… А вось масаж маленства, пэўна, усе адчулі на сабе: «Рэйкі-рэйкі, шпалы-шпалы…» Гэта вельмі лунінецкі масаж. Дарэчы, друз з гранітнага кар'еру пераважна ідзе на будаўніцтва і рэканструкцыю беларускіх чыгуначных шляхоў. А цягнікі са сталіцы прыходзяць у Лунінец уначы і ў сталіцу сыходзяць уначы. Таму Лунінец для мяне — начны вузел. Скрыжаваныя стрэлы на гербе Лунінца сімвалізуюць вузел чыгуначных дарог.

Драўляныя сродкі руху

Толькі не падумайце, што я пра конскія падводы. У 1930-я гады Васіль Ілючык, каваль з Багданаўкі, змайстраваў драўляны ровар. Ад'ездзіўшы два гады, гаспадар прадаў яго Пінскаму краязнаўчаму музею. І цяпер можна пабачыць яго і ўразіцца чалавечай празе руху.

Музыка неба

Богам дадзеная вёсачка натхняе, як натхняе і горад, які лунае, у якім нелегальна працаваў настаўнікам і стварыў частку паэмы «Сымон-музыка» Якуб Колас. Таму ў гэтай паэме можна адчуць музыку Лунінца, — мястэчка, дзе на прывакзальнай плошчы стаіць помнік скаральнікам космасу, што болей нагадвае статую Свабоды. І ёсць помнік авіяканструктару Сухому, які сустрэў у Лунінцы сваё каханне. І таксама настаўнічаў, але легальна.

Сардэчная ягада

Лунінеччына — край людзей, якія росцяць сэрцы. Гэта найскладанейшая ювелірна-хірургічная праца. Бо напачатку трэба зрабіць перасадку часткі расліны, потым яе гадаваць, палоць, абразаць, перажываць за яе, ахоўваць, паспець сабраць сабе і натхніць ёю іншых. І няхай не кожная труская прымае форму сэрца, у кожнай ягадцы — шчырае сэрца лунінецкай зямлі. Стацца шчаслівым найлягчэй у чэрвені, прыехаўшы ў які заўгодна куточак, ад Любані да Малых Чучавіч. А калі ў трускалкавую сталіцу ахвота — дык вам у Дварэц.

Палескі дзівак

Рымскія паэты знаходзяць свой супакой у Кажан-Гарадку, а кажан-гарадоцкія гаспадары не даюць спакою ў Рыме. Некалі Крыштоф Шчыт, апрануўшыся «ў Хрыста» і ўзяўшы ў руку пальмавы ліст, сустрэў картэж Папы. Пасля скандалу Крыштофу давялося пакінуць Рым. Але не быў бы ён Шчытом, каб за некалькі гадоў не вярнуўся і не дамогся аўдыенцыі ў Папы. Калі паляшчук павінен быў пацалаваць папскую пантофлю, дык укусіў Папу за палец нагі. «Калі Папеж ёсць святы, не павінна яму ад гэтага балець», — рагатаў Крыштоф, апавядаючы пра здарэнне. Але рагатаў пазней, бо гэтым разам яго пасадзілі ў вязніцу, і толькі праз некалькі гадоў яго выкупілі, прадаўшы адзін з палескіх маёнткаў. Чаго толькі яшчэ не здаралася з Крыштофам Шчытом! На мяжы сваіх уладанняў з царскімі дзяржаўнымі землямі Шчыт загадаў паставіць слупы з надпісам з аднаго боку «дзяржава Шчытоўская», а з другога «дзяржава Расійская», на што падкупленая царская адміністрацыя глядзела скрозь пальцы... Упэўненая, што Крыштоф Шчыт варты помніка, бо калі каму і ставіць помнікі, дык паэтам і дзівакам.

Паміж сквапным Пінскам і шчодрым Кажан-гарадком

Калі праектаваўся ўчастак чыгункі Баранавічы–Сарны, інжынеры прапанавалі ўгоду пінскім габрэям: за ўзнагароджанне правесці дарогу праз Пінск. Тыя пасквапнічалі, упэўненыя, што без Пінска і так не абыйдуцца. А Крыштоф Шчыт сам аддаў 10000 рублёў золатам, каб толькі чыгунка абмінула ягоныя ўладанні.

Вось так, дзякуючы сквапнасці і шчодрасці, Лунінец неспадзявана і залунаў на Палессі, атрымаўшы магчымасці для развіцця.

Мікалаеўская і Юраўская бажніцы

Узносяцца ў неба беларускія храмы. Найбольш значныя тут былі збудаваныя як уніяцкія. Гэта Мікалаеўская царква ў Кажан-Гарадку і Юраўская царква ў вёсцы Сінкевічы. Свята-Мікалаеўская бажніца паўстала ў 1818 годзе. Пасля знішчэння уніі прыход стаўся праваслаўным, але бунты, калі прыхаджане дамагаліся вяртання ў унію, адбываліся яшчэ цягам некалькіх дзесяцігоддзяў. Храм спалучае ў сабе рысы барока і тыповага палескага дойлідства. З часоў уніі ў ім захаваліся разбяны пазалочаны іканастас і алтары з драўлянымі скульптурамі.

Свята-Юраўская царква — адна з найстарэйшых драўляных бажніцаў рэгіёну (мяжа 17–18 стст.), у якой захавалася багата прыгожых старасвецкіх абразоў. На вялікі жаль, належнай увагі гэтаму ўнікальнаму храму няма. Але і «ўвага» ў сённяшняй Беларусі — рэч таксама небяспечная: колькі ўнікальных драўляных храмаў апошнім часам было знявечана, ператорана ў псеўдарасейскія пародыі, і ніхто за гэта не адказвае.

«Беларуская граматыка» ад святара

А вось найстарэйшае паселішча ў ваколіцах Лунінца — вёска Лунін. Знакамітая яна ў першую чаргу тым, што ў ёй у 1875 годзе святар Барысаглебаўскай царквы Платон Ціхановіч стварыў рукапісную «Беларускую граматыку». Наведваючы царкву, не забудзьцеся паставіць свечку за святара, які любіў беларускае слова.

суВЯЗь

А звязваюць усе куточкі Лунінеччыны, вядома ж, сакральныя вязы — магутныя дрэвы, якія жывуць да 400 гадоў. Яны ж надзеленыя і моцай аберагаць, таму з іх робяць абярэгі для хатаў альбо саджаюць побач, прывязваючы вязы да сваёй зямлі і прывязваюцца да іх самі.

Націск на пачатку

Адразу не папярэдзіла, таму не ведаю, куды вы ставілі націск: на ЛУнінец ці на ЛунінЕц. Афіцыйнасць вымагае канца, душэўнасць палешукоў — пачатку…



Нараджэнне воблака. Мікашэвіцкі гранітны кар'ер

ЮБІЛЕЙ

БЕЛАРУСКІМ ШЛЯХАМ. АРСЕНЮ ЛІСУ — 80!

Кажучы пра феномен беларускага шасцідзясятніцтва, даследчыкі, зазвычай літаратуразнаўцы, амаль заўсёды імкнуліся весці паралелі са «старэйшым братам», у якога былі Еўтушэнка, Раждзественскі, Вазнясенскі, Ахмадуліна, Акуджава, плошча Маякоўскага, вечары на стадыёнах і ў Політэхнічным. Раўнаючы на беларускую сітуацыю, адзначалася, што ў нас, маўляў, таксама было сёетое, але маштабы не тыя…

Ушчэнт забываліся людзі на спецыфіку.

Беларускае шасцідзясятніцтва было ў першую чаргу нацыянальна-арыентаваным па сваёй сутнасці. Зрабілі яго феноменам, як ні дзіўна, не толькі і не столькі пісьменнікі, а навукоўцы-гуманітарыі: Міхась Чарняўскі, Генадзь КахаКаханоўскі, Міхась Ткачоў, Мікола Ермаловіч, Зянон Пазьняк, Генадзь Кісялёў і, безумоўна, Арсень Сяргеевіч Ліс, які 4 лютага адзначыў сваё 80-годдзе.

Менавіта руплівая праца гісторыкаў у 1960–1980-я гады — збіранне і захаванне, перадача з вуснаў у вусны, з рук у рукі фактаў, кніг, вусных успамінаў, а пазней і правядзенне праз цэнзурныя рагаткі да публікацыі — дазволіла ўзнавіць нацыянальны праект у надзвычай складаных варунках савецкага часу, а пазней, у час паўстання незалежнасці, за некалькі гадоў стварыць нацыянальны варыянт гістарыяграфіі.

У кола аднадумцаў кожны трапляў сваім, часам вельмі пакручастым шляхам. Для Арсеня Ліса беларускасць была роднай, яна спадарожнічала яму з самага маленства.

…Ён — заходнік. Як можна прайсці наўзбоч беларушчыны, калі бацьку твайго вучыў у школе Язэп Гаўрылік, які неўзабаве стане паслом польскага сейма; калі цётка твая выходзіць замуж за паэта Алеся Салагуба, а дзядзька Васіль аздабляе графікай беларускі часопіс «Маланка». У хаце тваёй некалі спыняўся Сымон Рак-Міхайлоўскі. Пад падушкай у цябе ляжыць хрэстаматыя «Родны край» Леаніды Чарняўскай, часопіс «Заранка» і пецярбургскае, «заглянесонцаўсакае» «Другое чытанне» Якуба Коласа. Маці і бацька, сялянка і чыгуначнік, спяваюць на два галасы «Не загаснуць зоркі ў небе…», «Зорку Венеру», а дзядзька Рыгор спыняе цябе ў двары і патрабуе прадэкламаваць «Хто ты гэткі? Свой, тутэйшы».

Сёння гэта гучыць як фантастыка. Тым не менш, у Заходняй Беларусі было нямала такіх мясцін, і Лісава вёска Вётхава на Смаргоншчыне зусім не была «беларускім гета»: хапала сваіх беларускіх дзеячаў, палітыкаў, паэтаў, мастакоў і ў суседняй гміне, і ў суседнім ваяводстве…

І як тут не станеш даследчыкам культуры Заходняй Беларусі?!

Зрэшты, да сваёй тэмы Арсень Ліс падступіўся не адразу. Была вучоба на філфаку БДУ, праца ў Шаркаўшчыне ў мясцовым РАНА, а неўзабаве — пераезд у Мінск, на працу ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Хто толькі не тупаў калідорамі выдавецтва ў 1957–1959 гады, калі там працаваў малады Ліс. Прыязджалі з высылкі і турмаў былыя «маладнякоўцы» і «ўзвышэнцы», заходзілі ў выдавецтва са сваімі новымі кнігамі, а хто навечна застаўся за кратамі, рукапісы тых прыносілі жонкі і дзеці. Наведваліся і маладыя. Не ўсе ведаюць гэты факт, але, каб не Арсень Ліс, застаўся б першы зборнік Уладзіміра Караткевіча без вершаў «Паўлюк Багрым» і «У векавечнай бацькаўшчыне клёны…». Першы з іх быў прызнаны двухсэнсоўным, а другі проста выкінуў з рукапісу рэдактар «Матчынай душы».

«Заходніцтва» вярнулася ў аспірантуры Акадэміі навук, куды Ліс паступіў у 1959 годзе, ды так і застаўся з Акадэміяй на ўсё жыццё. Першая ж тэма, «Народна-паэтычная творчасць Заходняй Беларусі», стала лёсавызначальнай, як быццам распаўшыся на дзве асобныя: заходнебеларускае мастацтва і народную песню, за якой навуковец дзесяцігоддзямі ездзіў па ўсёй Беларусі, запісваючы на магнітафон, парадкаваў у дыхтоўныя тоўстыя тамы серыі «Беларуская народная творчасць», аналізаваў у фалькларыстычных манаграфіях. Збіраючы матэрыял для дысертацыі, Арсень Ліс перагарнуў падшыўкі ўсіх заходнебеларускіх перыёдыкаў, а неўзабаве выйшаў і на старых беларускіх дзеячаў: Зоську Верас, Янку Багдановіча, сыноў Антона Луцкевіча і многіх іншых. Завязаліся знаёмствы, паляцелі з Вільні ў Менск доўгія лісты, праз якія адкрывалася невядомая, замкнёная ад староннягa вока гісторыя Беларусі. З цягам часу фактура ўвасобілася ў кнігах пра Браніслава Тарашкевіча, Язэпа Драздовіча, Язэпа Горыда, Міколу Шчакаціхіна, Пётру Сергіевіча — кнігах вельмі чулых, набліжаных да мастацкай прозы, і ў той жа час вельмі насычаных унікальнымі звесткамі. Мажліва, гэтыя біяграфіі, якім неўзабаве ўжо стукне паўвека, пацяху старэюць. Але замяніць іх пакуль няма чым. І не вельмі рвуцца наступнікі, каб дапоўніць сказанае Лісам, напісаць абʼёмнейшыя і лепшыя кнігі. Да таго ж — Арсень Сяргеевіч мог запраста ўдакладніць нешта ў жонак Тарашкевіча і Шчакаціхіна, у самога Пётры Сергіевіча, у сваякоў і землякоў Драздовіча, у віленскіх беларусаў. У каго сёння спытаецца даследчык? Толькі ў архіўных папераў і… у самога Арсеня Ліса, чыя памяць — «томов премногих тяжелей».

…Ён — інтэлігент: акуратны і гжэчны, асцярожны ў ацэнках і ўважлівы да іншага меркавання. І размова з ім, і чытанне ягоных кніг — заўсёды інтэлектуальнае задавальненне і, адначасова, праверка і ўрок.

…Ён — чалавек, на якога хочацца быць падобным.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

100 – 80 =

Арсеню Лісу

Калі ад дзесяцёх дзясятак
Восем
Адняць —
Не дваццаць застанеца,
А роўна гэтулькі,
Каб зноў
Нашчадкай песняй
Разгавецца,
Папасвіцца
Ў краіне сноў.

Яшчэ ў Арсеня
Дваццаць год
Ёсць у запасе
Для нагод!

4 лютага 2014
Рыгор БАРАДУЛІН

ДЭБЮТ

«ЗДАЕЦЦА: БЕЛАРУСЬ МАЎЧЫЦЬ…»

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

У дадзеным выпадку дэбютуе, упершыню выступае публічна са сваімі вершамі Ірына Дубашынская. Знаёмае прозвішча? Ну так, знаёмае, добра вядомае, асабліва мінчанам старэйшага пакалення, якія яшчэ памятаюць такія спектаклі нацыянальнага рэпертуару, як «За лясамі дрымучымі», «Брама неўміручасці», «Трыбунал», «Адкуль грэх», «Плач перапёлкі», «Парог», у якіх выдатна сыграў характэрныя і камедыйныя ролі, стварыў яркія сцэнічныя вобразы народны артыст Павел Дубашынскі. Бацька Ірыны Дубашынскай.

«Памятаю, я пачала пісаць вершы недзе з дзесяці гадоў, — піша ў сваім лісце да мяне Ірына. — Па-руску і па-беларуску. Бацька (светлая яму памяць) выбраў беларускія, прачытаў і кажа: «Дачушка, трэба ўсё ж пісаць на той мове, на якой ты думаеш, на якой марыш. Недарэмна ж яе завуць роднай, матчынай». Сам ён быў для мяне жывым прыкладам. Ён не толькі прыгожа размаўляў на роднай мове, развучваў на ёй тэксты пʼесаў, спяваў, але, як казаў не раз, думкі думаў толькі на сваёй, бацькавай дадзенай мове. Пэўна таму менавіта яму давяралі чытаць на радыё тэксты без папярэдняга запісу. Вечарам дадуць, а раніцай ён ужо чытае. Дакладна, чыста, без памылак. Бацькаў прыклад, гэтая самая генетычная памяць робіць сваё. Пішу па-беларуску. Набраўшыся храбрасці, рашыла даслаць некалькі Вам. Каб запытацца, ці ёсць у іх паэзія. Бо паэзія — гэта ж, мабыць, не толькі бяздумнае рыфмаванне, а гэта думка-сэрца-талент?»

Такі вось ліст (разам з вершамі) атрымаў я напачатку Новага года. Не мог, натуральна, не пазнаёміцца з вершамі. Першымі вершамі Ірыны Дубашынскай — дачкі знанага акцёра-патрыёта Паўла Піліпавіча Дубашынскага. Балазе, сустракаліся з ім, сябравалі, ездзілі, памятаю, на Віцебшчыну і ўсю дарогу, была асабліва на зваротным шляху, былі ў палоне яго вясёлага пеўчага дару… «Так, у Пашы быў моцны голас і тонкі музычны слых, — згадвае Марыя Захарэвіч, калі я прачытаў ёй некалькі вершаў Ірыны, мы абмяняліся ўражаннямі і калі потым загаварылі пра бацьку. — Акцёр быў ён цудоўны. І сапраўдны беларус. Не дзіва, што і дачка турбуецца за мову, сама піша вершы. Яблык ад яблыні, як кажуць…»

Гаворым яшчэ з Марыяй пра той адметны факт, што нягледзячы на не самыя спрыяльныя ўмовы, на час не столькі паэтычны, колькі палітычны, ідзе ўсё ж у паэзію шмат моладзі, прытым патрыятычна настроенай. Марыя Георгіеўна, быццам у якасці аргументу, прыводзіць радкі аднаго са сваіх любімых твораў — верша Пімена Панчанкі «Край паэтаў»:

Там чарнічныя ўсе ночы,
Сунічныя ранкі,
Там народ найболей любіць
вершы Янкі…

Прыведзены вышэй ліст Ірына Дубашынскай пачынае з прызнання ў тым, як яна апошнім часам адкрывае для сябе па-новаму скарбы беларускага паэтычнага слова — і «вершы Янкі», і творы сучасных аўтараў. Ну а цяпер давайце пазнаёмімся з яе ўласнымі вершамі.

ІРЫНА ДУБАШЫНСКАЯ

Полацкія крыжы

Плыве над Дзвіною
па небе сабор.
Дакранаецца аж крыжамі
да зор.
Узносіць малітвы свае
да Бога.
А з неба глядзяць серафімы
строга.
І нам у зямной нашай імжы
Здаецца, што ўзносім свае
крыжы,
Якія нясем мы ўсе,
як хто можа…
Памілуй і злітуйся, Божа!
Плыве над Дзвіною сабор.
Крыжамі сягае да зор.

Пра двухмоўе

Гавару на адной,
А тужу па другой.
Ужываю адну,
А надзею другой сустракаю.
І на ёй я, толькі на ёй.
На сваёй
Сваё шчасце гукаю, гукаю.

Пра нас

Вось здаецца:
Беларусь маўчыць.
Бо не чую ж мовы роднай.
Ціха.
Ці ў глуханемачы
сваёй крычыць:
«Дзе вы, мае дзеці?!»
Ліха,
Вы сляпыя і глухія вы?
Што, не бачыце вы
катастрофы?
Што, не ўзняўшы нават
галавы,
Ідзеце пакорна да Галгофы?!

* * *

Скончылася ўсё. Крычу:
«Што дзеецца навокал?!»
Скончылася ўсё. Шапчу:
«Чаму так адзінока?!»
Скончылася ўсё. Маўчу.
Да Бога так далёка!.

На далоні ў Бога

Угору ішла.
Угору ішла.
Угору ішла і гукала я.

Гукала свой лёс.
Гукала свой лёс.
Гукала і не спазнала я.

І не дайшла.
І не дайшла.
І не дайшла, і ўпала я.

Ды ўзняў і панёс.
Ды ўзняў і панёс…
А думала, што нядалая.

САМ-НАСАМ

Валеры ДУБОЎСКІ: «ГАЛОЎНАЕ Ў ЖЫЦЦІ — НЕ БЫЦЬ, А ЗБЫЦЦА»

— Шаноўны Валеры Леанідавіч, нядаўна свет пабачыла Вашая кніга «На пачатку маўчання». У ёй ёсць верш з такімі радкамі «…Столькі слоў, // І няма паэзіі». А што Вы лічыце сапраўднай паэзіяй, якую ролю яна выконвае ў Вашым жыцці?

— І ў прыгожым слове, і ў прыгожым па форме вершы можа не быць паэзіі. Адбываецца гэта, калі няма ў іх душы, калі творца насамрэч не творца, а штукар. Яго стыль — кідкі, правакацыйны сцёб, каб заўвыжылі… Успомнім: «паэзія» паходзіць ад грэцкага слова «творчасць». А некалі І. Гердэр трапна і назаўсёды вызначыў, што паэзія ёсць «музыка душы».

Спрэчкі пра паэзію, яе стан цягнуцца ад старажытнасці. Развагі пра душу, пра тое, ці ёсць яна і што гэта такое, калі не мітусня атамаў, — ад Платона, ад Цыцэрона. Абвінавачванні ў мадэрнізме — таксама адтуль, ад часоў Валерыя Катула, сучасніка Цыцэрона, Цэзара (апошняе стагоддзе да новай эры). Менавіта рымскі дыктатар кпіў з Катула за тое, што ён на вякі заплямію яго імя ў сваіх вершыках. Ды і сам паэт свае творы лічыў за драбязу, забаўкі. Праз многія стагоддзі ягоныя «забаўкі» зрабіліся канонам, а ў сусветнай літаратуры паклалі пачатак новаму жанру — лірычнай паэзіі.

Дарэчы, Валеры Катул — з «неатэрыкаў», што ў перакладзе на сучасную мову — з мадэрністаў.

У паэзіі ўсё ўжо некалі было. Не было ў мінуласці толькі нас, нашых пачуццяў, нашай музыкі душы. Быць паэтам — мець душу, быць творцам, з не абы-якім чалавечым досведам.

На жаль, праявы сённяшняй цывілізацыі палохаюць падменай сапраўдных чалавечых каштоўнасцей, пачуццяў штучнымі элементамі глабальнай матрыцы — прыгожа, ярка, спакуслiва ўкладзенай у галовы праз навушнікі, маніторы, тэлеэкраны… Чалавек губляе адчуванне рэальнасці, не заўважае прыгажосці сапраўднага жыцця, яго боляў і радасцей. Ён і сябе не адчувае, не шукае сваю самасць, не рэалізуе ў сабе боскі дар, сваё прызначэнне. Галоўнае ж у жыцці — не быць, а збыцца.

Чалавек ёсць чалавекам, калі ён творца, і не толькі ў паэзіі.

— Вы пачалі пісаць вершы яшчэ ў школе, але потым замаўчалі, і маўчанне цягнулася каля 20 гадоў (з 1980-х да 2003 года). І вярнуцца да вершаў Вас падштурхнуў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Сярод творцаў (вашага пакалення), што «замаўкалі», але потым зноў вярталіся ў літаратуру, можна згадаць, напрыклад, Леаніда Галубовіча… Чым было выклікана Вашае маўчанне?

— Як і ў Леаніда Галубовіча, выдатнага і ўдумлівага літаратурнага крытыка, у любога, хто раптам «замаўкае», свае падставы. У мяне, насамрэч, «маўчанне» было некалькі. У школьныя, шасцідзясятыя гады, падчас аршанскага жыцця, кінуў творчыя спробы пасля раптоўнай смерці бацькі. Чатырнаццацігадовы, я застаўся ў сям'і старэйшым з мужчын. Паэтычны рамантызм дымам пайшоў. Галоўным стаў пабытовы клопат пра выжыванне. Маці, пенсіянерка па інваліднасці, якая страціла здароўе ў партызанскім атрадзе, стала працаваць не магла, а яшчэ ж, акрамя мяне, трое меншых дзяцей…

Матэрыяльныя цяжкасці падштурхнулі кінуць і вучобу на філфаку БДУ ды пайсці ў войска. Затым завочная вучоба на журналістыцы, вар'яцкі газетны рытм, гойсанне па палях і фермах, пераезды з раёна ў раён, з вобласці ў вобласць. Вучоба, праца, малыя дзеці, адказныя пасады, сур'ёзныя грамадскія нагрузкі…

Другі раз пачаў пісаць пад уплывам Рыгора Семашкевіча, з якім былі ў добрых сяброўскіх адносінах. Пасля рэдактарскай пасады ў карэліцкай раённай газеце «Полымя» на Гродзеншчыне быў накіраваны на два гады вучыцца ў Мінскую вышэйшую партыйную школу. У суседнім квартале на вуліцы Карла Маркса жыў Рыгор. Бачыліся амаль штодня. Ён мне адкрываў вочы на шмат якія моманты ў беларускай літаратуры, яе трагічнай гісторыі. Распавядаў пра лёс Янкі Купалы, пра арышты, расстрэлы нацыянальных пісьменнікаў, іншых дзеячоў культуры. Яму я даводзіў таямніцы ў рэальнай савецкай гісторыі, у біяграфіях бальшавіцкіх лідэраў, у эканамічнай палітыцы і сапраўдным становішчы ў краіне… Рыгор Семашкевіч ведаў пра мае літаратурныя памкненні. Прымусіў паказаць. Прозу, паэзію… Вершы параіў схаваць, бо пасадзяць ці запіхнуць у вар'ятню. А прозу ўхваліў і парасіў перадаць яму машынапісны варыянт, а ён ужо аднясе ў часопіс: «Можна друкаваць». Проза была нестандартная, накшталт таго, што пазней Алесь Разанаў вытварыў у асобны жанр і назваў версэтамі, зномамі… Мяне ж вывелі на тую сцяжынку творчасць Пришвіна і, як ні дзіўна, стылёвы почырк Кузьмы Чорнага, майстра буйных жанраў.

Зрабіў машынапісны варыянт і… усё спаліў. Унутры сядзела сумненне, а яно цвіліла сумленне… Адчуваў праз гэтую ломку, што гавару не напоўніцу, больш замоўчваю. Няшчыра. Калі Рыгор знаёміў мяне ў двары свайго дома з Караткевічам, то, назваўшы аршанцам і яго земляком, дадаў: «Піша і кідае ў агонь». Уладзімір Сямёнавіч зарагатаў: «Гогаль! Спачатку трэба друкавацца, а тады ўжо паліць. Рукапісы гараць…» І засумаваў раптам, і шчыра развітаўся з намі на фразе «Не беражэм мы сябе, беларусы…»

«Маўчаў» я да сярэдзіны 2003 года. Зноў мяне падштурхнуў Рыгор, Рыгор Барадулін. І доказ прывёў, што калі з дзяцінства нешта такое муліць, то, можа, Бог заклаў. Грэх не пісаць, не рэалізоўваць сваё наканаванае. А думкі пра тое, каму і навошта гэта трэба…

Апошнім часам паэзія, творчасць зрабілася неад'емнай жыццёвай патрэбай, роўнай самому жыццю, працы, спасціжэнню сябе, беларускага лёсу, свету, таямніцы быцця.

«Маўчанне» ў жыцці — цяжэйшае, чым у творчасці. Не выказвацца «за», не рабіць подлае, не пісаць на патрэбу, не даносіць, калі ад большасці падтрабавалася якраз іншае… Апошняе было лягчэй і выгадней.

Такое маё апраўданне перад сабой, што тычыцца маўчання як пісьменніка, ды і не толькі. Вольны па выхаванні чалавек пераcананы, што жыць трэба смела. Усё магчыма, калі бярэшся зрабіць нешта патрэбнае грамадству, а не дзеля ўласнай карысці. Таму і браўся як кіраўнік за праекты рызыкоўныя, але бясспрэчныя ў сэнсе грамадзянскім, чалавечым, прафесійным. Зусім свядома, без усялякага дазволу (а яго проста быць не магло), напрыклад, у выдавецтве «Беларусь» мы выдалі ў 1991 годзе поўны кананічны тэкст «Бібліі» з навуковым каментаром. Праўда, па-расейску, бо беларускі пераклад з'явіўся пазней. Але ўпершыню ў Савецкім Саюзе (за ўвесь савецкі час) мы адзіныя ў дзяржаўным выдавецтве накладам 33 тысячы асобнікаў выдалі забароненую Кнігу кніг. Дагэтуль яе, не трымаўшы ў руках, пляжылі ўсімі сродкамі атэістычнай прапаганды. Прызнаюся: у газеце, у таварыстве «Веды» займаўся тым і я…

— Вы — галоўны рэдактар календара «Першапачатак», выхад якога быў прымеркаваны да 80-годдзя Саюза беларускіх пісьменнікаў. Праца над праектам доўжылася больш за год. Як вялася здымачная праца і падрыхтоўка календара? Ці былі нейкія містычныя ці кур'ёзныя выпадкі падчас працы?

— За кадрам засталіся імгненні «дакранання» да выдатнай беларускай літаратуры. Да высокіх духам, талентам асобаў, да іх эмоцый. Разам шукалі вобраз, вымалёўвалі яго не словам, а іншымі сродкамі.

Містычныя, кур'ёзныя выпадкі? Анатоль Вярцінскі (Жыцень) узгадаў раптам на жытнёвым полі пад Лагойскам, што першая ягоная кніжка паэзіі называлася «Песня пра хлеб» і пабачыла свет у 1962 годзе, роўна паўвека таму. З аўтарскім аўтографам яна захоўваецца цяпер у мяне як адна з каштоўных рэліквій.

Не веру ў прымхі, але ў календары «Першапачатак» партрэтаў літаратараў атрымалася 13. «Чорная магія» асветлена, дзякуй Богу, чатырнаццатай мадэллю — дзяўчынкай Евай, якая ў кадры разам з Баем, шаноўным Генадзем Бураўкіным. Пятнаццаты герой здымкаў — руды кот Рысік. Ён абсалютна арганічна дапоўніў вобраз Дамавіка — свайго гаспадара, Рыгора Барадуліна. Уявдзьдзька Рыгор, праўда, даў жывёліне за яго брыдкія справы мянушку Усярысік…

Ці будзе працяг праекта? Не ведаю. Патрэбны вялікія сродкі. Але прыватны мой творчы інтарэс доўжыцца. Хочацца паступова зрабіць партрэты некаторых іншых пісьменнікаў. Не толькі знакамітых, але і маладых, якія распачынаюць заўтрашнюю беларускую літаратуру. Ёсць ужо некалькі фотаздымкаў…

— Дзякуючы Вам як дырэктару выдавецтва «Беларусь» напрыканцы 80-х — пачатку 90-х гадоў пабачылі свет кнігі Аркадзя Смоліча, Юрыя Туронка, Вацлава Ластоўскага, а таксама шмат іншых смелых для свайго часу і запатрабаваных выданняў. У 1995 сталі старшынёй праўлення выдавецтва і друкарні ЗАТ «Юніпак». Упершыню ў краіне перавыдалі «Катэхізіс» Сымона Буднага, Біблію («Пацікніжжа») у перакладзе на беларускую мову айца Уладзіслава Чарняўскага. Якім чынам Вы вызначаеце кнігі, вартыя для выдання? І што ў найбліжэйшых творчых ды выдавецкіх планах?

— Як ствараюцца цікавыя кнігі? Трэба самому выдаўцу быць у авангардзе, мець шырокі досвед, супрацоўнічаць з разумнымі, сумленнымі, смелымі і таленавітымі, нацыянальна свядомымі людзьмі. Патрыётамі, а не «этнічнымі беларусамі» з рэзервацыі. Так называе Барадулін тых, хто свядомы толькі ўзорам на кашулі, якую апранае напаказ, а ў душы…

Амаль падрыхтаваны да друку насценны перакідны каляндар на 2015 год «Мудраслоўе беларусаў». Імкнуліся да выразнага раскрыцця нацыянальнай скарбонкі слова, паэтыкі, думкі. Праз тэкст, праз тэматычныя ілюстрацыі, якія адмыслова выканала цудоўная наша мастачка Юлія Рудзіцкая.

У гэтым годзе выйдзе ў свет апошні, чацвёрты том знакавага, лічу, для Беларусі выдання, падрыхтаванага сумесна з Міністэрствам замежных спраў, Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Нацыянальным архівам — «Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914 — 1991 гг.)». У ім упершыню сабраныя ў пяці кнігах, кожная аб'ёмам больш за 40 — 50 уліковых выдавецкіх аркушаў, гісторыя пра нашу дзяржаву ў дакументах. Як нас дзялілі без нас, як цынічна ўсе дзяржавы наўкола ірвалі і тэрыторыю, і гонар, і дух маладой нацыі… Суседзі вялікія і малыя. У гэтых тамах шмат адкрыццяў, фактаў, лічбаў, падказак, засцярогаў, як для дзяржаўных палітыкаў, так і апазіцыйных. Адно шкада (грошы!) — малы наклад, 50 асобнікаў.

Кажуць, хочаш рассмяшыць Бога, раскажы пра свае планы. І ўсё ж прызнаюся: рыхтую да выдання яшчэ адну, а то і дзве свае кнігі: «А» і «Графіці». Гэта зноў паэзія.

Смяшыць Найвышняга — вельмі цікавая справа. Ды хто каго смяшыць — ці не Ён, нас стварыўшы? Адзін з маіх вершаў у выдадзенай летась кнізе так і называўся: «Боскія казытанкі».

Гутарку вёў Алесь Сачанка

Валеры Дубоўскі — літаратар, выдавец. Аўтар кнігі паэзіі «На пачатку маўчання» (2013). Нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Хацькова на Шклоўшчыне. Сябар ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». Жыве ў Мінску.

Упершыню ў Савецкім Саюзе (за ўвесь савецкі час) мы адзіныя ў дзяржаўным выдавецтве накладам 33 тысячы асобнікаў выдалі забароненую Кнігу кніг. Дагэтуль яе, не трымаўшы ў руках, пляжылі ўсімі сродкамі

З новымі вершамі Валеры Дубоўскага чытачы «новачасаўскай» «Літаратурнай Беларусі» змогуць пазнаёміцца ў бліжэйшых нумарах выдання.

ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

БІБЛІЯТЭКА ЕЎРАМАЙДАНУ

5000 кніг — такую калекцыю сабрала бібліятэка Еўрамайдану за першы тыдзень працы. Выданні, прадстаўленыя тут, — мастацкія творы ўкраінскіх і замежных аўтараў, літаратура пра рэлігію, бізнэс, медыцыну.

Пасля завяршэння працы бібліятэка Еўрамайдану плануе перадаць усе выданні чытачам з украінскіх сёлаў у рамках праекта «Сто кніжак для вясковай бібліятэкі».

Як паведамляе афіцыйная старонка бібліятэкі Еўрамайдану ў Facebook, кніг кожны дзень прыносяць вельмі шмат, і валанцёры сёння актыўна займаюцца структурызацыяй літаратуры па тэматыцы і алфавіце. Прыдуманы і правілы карыстання бібліятэкай, галоўнае з якіх: «Прачытаў — вярні», хоць фармальна ўлік выдачы і звароту выданняў не вядзецца — літаратуру выдаюць «пад слова гонару». Акрамя таго, у правілах значацца наступныя актуальныя для Еўрамайдану запісы: «Кніга — не шына, для барыкадаў выкарыстоўвай іншыя матэрыялы», «Кніга — не камень, не шпурляй ёю ў Беркут», «Кніга — не дровы, у бочку не кідай», «Кніга — не ўсцілкі, старонкі ў чаравікі не кладзі».

Варта нагадаць, што пра сам Еўрамайдан дзясяткі пісьменнікаў — і не толькі ўкраінскіх — ужо напісалі каля сотні тэкстаў: вершаў, эсэ, апавяданняў…

КНІГА, ЯКАЯ ПАКАЗВАЕ НАСТРОЙ

Sensory Fiction — унікальны праект навукоўцаў Масачусецкага тэхналагічнага інстытута. Адмысловая кніга, якая была створана тут, дазваляе адсочваць унутраны стан чытача і з дапамогай асвятлення і вібрацый адлюстроўваць яго.



«Разумная» кніга у святлодыёднай вокладцы адсочвае некалькі ключавых паказчыкаў: тэмпературу цела, пульс, ціск і інш. Пры моцных перажываннях вокладка пачынае свяціцца і вібраваць, што дадаткова ўзмацняе эфект ад чытання кнігі.

ГОД ЛІТАРАТУРЫ Ў РАСІІ

2015 год у Расіі абвесцяць Годам літаратуры.

Адбылася нарада па пытанні яго правядзення. Падчас дыскусіі ўдзельнікі выказалі свае прапановы адносна плану мерапрыемстваў. Агенцтва «Расдрук» прымае прапановы па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў у межах Года літаратуры.

У абмеркаванні прынялі ўдзел Уладзімір Талстой, дарадца прэзідэнта РФ, Веніямін Каганаў, намеснік міністра адукацыі і навукі РФ, Алена Зелянцова, першы намеснік кіраўніка дэпартамента культуры Масквы, Аляксандр Архангельскі, пісьменнік, член рады па культуры пры прэзідэнце РФ, Алег Новікаў, віцэ-прэзідэнт Расійскага кніжнага саюза, Аляксандр Эбанаідзе, галоўны рэдактар часопіса «Дружба народов», Барыс Тарасаў, рэктар Літаратурнага інстытута імя Горкага, Віктар Фёдараў, прэзідэнт Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, і іншыя дзеячы навукі і культуры.

Як заявіў Міхась Сеславінскі, кіраўнік Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях, Год літаратуры — «добрая магчымасць ссунуць з мёртвай кропкі шматлікія праблемы. Трэба вылучыць прыярытэтныя і жыццяздольныя тэмы, якія складуць план мерапрыемстваў Года літаратуры».

НЕВЯДОМЫЯ ТВОРЫ ШУКШЫНА

Супрацоўнікі Алтайскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў фондах музеяў і архіваў Расійскай Федэрацыі выявілі 24 творы Васілія Шукшына, якія раней не выдаваліся.

Калектыў навукоўцаў-філолагаў пад кіраўніцтвам Дмітрыя Мар'іна сабраў аўтографы, запісы, лісты і дакументы, якія мелі дачыненне да творчасці і асабістага жыцця пісьменніка і рэжысёра.

Найбольш каштоўнай знаходкай алтайскія навукоўцы называюць сцэнар да фільма «Адны» — з 1965 года ён захоўваўся ў архіве кінастудыі «Масфільм».

Матэрыялы падрыхтаваны для публікацыі. У ліпені 2014 года, да 85-годдзя з дня нараджэння Васілія Шукшына, плануецца выдаць 9-тамовы збор яго твораў, куды, у прыватнасці, увойдуць і знойдзеныя тэксты.

Фота з архіва пісьменніка

«ГОЛЫЯ ЧЫТАННІ» Ў ЛОНДАНЕ

Гэтае шоў — Naked Girls Reading — узнікла па іншы бок Атлантыкі, у Чыкага; яго стваральнікамі з'яўляюцца артыстка бурлеска Мішэль Ламур і яе партнёр Фрэнкі Вайвід. Аднак і ў Старым свеце гэтая забаўка з кожным днём становіцца ўсё больш папулярнай.

Па словах кіраўніцы лонданскага прадстаўніцтва шоў, ад наведвальнікаў літаральна няма адбою, а квіток на «дзейства» трэба браніраваць за месяц.

Шоў доўжыцца 2,5 гадзіны. На невялікай сцэне прыгожыя аголеныя дзяўчыны чытаюць урыўкі з твораў, аб'яднаных вызначанай тэмай. Правілы не дазваляюць выкарыстоўваць электронныя сродкі — толькі папяровыя кнігі, фрагменты якіх чытаюцца ўслых без мікрафона. Гледачы могуць хадзіць па зале ці заставацца за столікамі, піць віно і мактэйлі. І нічога іншага — ні стрыптызу, ні іншых эратычных забаў у шоў не ўключана.

Па словах людзей, якія наведалі Naked Girls Reading, аголеных дзяўчат праз некалькі хвілінаў перастаеш заўважаць, цалкам аддаючыся літаратуры. А аднойчы падчас «голых чытанняў» дзяўчына Абігайл Колінс прачытала публіцы і свае апавяданні. Літаратурны агент, які прысутнічаў у зале, ацаніў яе талент і неўзабаве прапанаваў кантракт на выданне твораў.

ГЕНДЭР

ЛІТКОНКУРС «ЖАНЧЫНА Ў ГІСТОРЫІ»

З мэтай узвысіць і апісаць на прыкладах мінулага талент і веліч жаночай душы, а таксама для напаўнення цікавымі матэрыяламі рубрыкі «Жанчыны ў гісторыі», украінскі вэб-партал для творчых, таленавітых ды ініцыятыўных «Жанчыны-УКРАІНСКІЯ» абвяшчае конкурс на лепшую публікацыю (нарыс) пра жанчын-украінак, якія сваімі добрымі справамі ў галіне нацыянальнай культуры, літаратуры, адукацыі, народнага мастацтва пакінулі добры след у жыцці грамадства.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца гісторыкі, літаратуразнаўцы, краязнаўцы, журналісты і ўсе, каго цікавіць дадзеная тэматыка.

Варта нагадаць, што падобныя мерапрыемствы – і ў планах Саюза беларускіх пісьменнікаў. Старэйшая творчая арганізацыя Беларусі плануе правядзенне агульнанацыянальнага літаратурнага конкурса і заснаванне адпаведнай прэміі за лепшую публікацыю ў галіне «Жаночая літаратура».

ПРЭМІІ

ПРЭМІЯ ІМЯ ЛЕСІ УКРАІНКІ

Камітэт па прысуджэнні ўрадавай прэміі імя Лесі Украінкі, якая ўручаецца за літаратурна-мастацкія творы для дзяцей і юнацтва, назваў імёны пераможцаў у чатырох намінацыях.

Лепшым літаратурным творам 2013 года прызналі кнігу «Шуршик В. та інші: Казки з Яринчиного саду» Надзеі Гумянюк. Выданне ўключае дзесяць казак, праілюстраваных таленавітай украінскай мастачкай Святланай Баляс.

У намінацыі «Мастацкае афармленне кніг для дзяцей і юнацтва» лепшай сярод выдадзеных у 2013 годзе журы прэміі назвала выданне «Пра фею Дарафею» Вікторыі Кавальчук.

Спектакль "Я не развіваюся…" па апавяданні Я. Артэменка, пастаўлены на сцэне Запарожскага акадэмічнага абласнога тэатра юнага гледача, атрымаў прэмію Лесі Украінкі як лепшая тэатральная пастаноўка для дзяцей і юнацтва, а поўнаметражны дзіцячы фільм «Іван Сіла» перамог у намінацыі «Кінатвор».

КНІГА ГОДА Ў БРЫТАНІІ

Лепшай кнігай года па версіі брытанскай прэміі Specsavers National Book Awards стаў раман Ніла Геймана «Акіян у канцы дарогі» («The Ocean at the End of the Lane»). Аб гэтым паведамляецца на сайце прэміі.

Раман Н. Геймана атрымаў перамогу ў адкрытым інтэрнэт-галасаванні, у якім чытачы выбіралі лепшага з дзесяці пераможцаў намінацый прэміі. «Акіян у канцы дарогі», як паведамляецца, істотна «адарваўся» па колькасці галасоў ад канкурэнтаў – твораў Малалы Юсуфзай, Роберта Харыса, Кейт Аткінсан і аўтара дзіцячых кніг Дэвіда Уоліамса.

Н. Геймана раней прызналі першым у катэгорыі «Лепшая аўдыёкніга года» (аўдыёверсію рамана ён запісаў сам).

Шортліст у кожнай з намінацый Specsavers National Book Awards штогод адбіраюць 50 экспертаў у галіне кнігавыдавецтва, прадстаўнікоў кнігагандлёвых сетак і літаратурных крытыкаў. Пераможцаў у асобных катэгорыях выбіраюць галасаваннем 750 акадэмікаў прэміі.

«Акіян у канцы дарогі» – апошні раман Н. Геймана, які выйшаў у 2013 годзе. Гэта гісторыя самотнага «кніжнага» хлопчыка, імя якога чытач так і не даведаецца, але ў якім беспамылкова пазнаюцца рысы самога Ніла Геймана.

У 2012 годзе лепшай кнігай года па версіі Specsavers National Book Awards стаў раман Е. Л. Джэймс «50 адценняў шэрага».

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў novostiliteratury.ru, Agence France-Presse, lenta.ru, ukrainka.org.ua

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by